WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ЛІСТАПАДА 2011 г.
СУБОТА
№ 226
(27090)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**БЕЛАРУСЬ і Расія падпісалі пагадненне аб продажы «Газпраму» акцый «Белтрансгаза» і кантракты аб аб'ёмах і ўмовах паставак і транзіту расійскага прыроднага газу ў Беларусь на 2012—2014 гады, перадае БЕЛТА.**

**Падпісанне гэтых дакументаў адбылося па выніках пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы ў Маскве ў прысутнасці прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Дзмітрыя Мядзведзева. Таксама падпісана міжурадавае пагадненне аб прадастаўленні ўраду Беларусі дзяржаўнага экспартнага крэдыту для будаўніцтва атамнай электрастанцыі на тэрыторыі Беларусі. Адбылося заключэнне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж ААТ «Беларускі аўтамабільны завод» і ААТ «Мечэл».**

**Акрамя таго, бакі падпісалі пагадненне аб парадку ажыццяўлення кантролю за наяўнасцю і мэтавым выкарыстаннем прадукцыі ваеннага прызначэння, якая пастаўляецца ў рамках Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб развіцці ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва ад 10 снежня 2009 года.**

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ПАВІННЫ РАЗАМ АДКАЗВАЦЬ НА ВЫКЛІКІ СУЧАСНАСЦІ»



Фота БЕЛТА.

Па традыцыі двухбаковая сустрэча папярэднічала пасяджэнню Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Гэта ўжо чацвёртая сустрэча прэзідэнтаў за апошнія паўгода. Кіраўнікі дзяржаў сустракаліся ў жніўні падчас нефармальнага саміту АДКБ у Астане, у Сочы, а таксама роўна тыдзень таму ў расійскай сталіцы на трохбаковых перагаворах з удзелам прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева.

Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў у час двухбаковай сустрэчы прыйшлі да адзінага меркавання, што Беларусь і Расія павінны разам адказваць на выклікі, якія ўзнікаюць на сучасным этапе перад дзяржавамі.

«Мы абмяркоўвалі многія праблемы і, шчыра скажам, выклікі, якія сёння ўзнікаюць перад нашымі дзяржавамі. Мы гэта не ўтойваем. Можа, вельмі публічна аб гэтым не гаворым. Але выклікі вялікія», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што прэзідэнты сышліся на думцы, што перад гэтымі выклікамі «хто-хто, а Беларусь і Расія павінны быць разам». «Гэта павінны ведаць усе», — падкрэсліў ён. «Абмяркоўваючы цяпер гэтыя пытанні, мы сказалі, што гэта непарушна», — дадаў беларускі лідар.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, бакі вырашылі, што павінны падпісаць усё, што падрыхтавана парадкам дня, каб нічога не адкладваць і не разбураць. «З'явіліся некаторыя нюансы, мы дамовіліся, што мы можам на працягу гэтага года гэтыя праблемы абмеркаваць і дадаткова ў двухбаковым фармаце на ўзроўні ўрадаў або прэзідэнтаў прыняць рашэнне», — сказаў беларускі лідар.

Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі не вычарпала свайго патэнцыялу.

«Калі мы дамаўляліся з Дзмітрыем Анатольевічам аб тым, што мы павінны правесці Вышэйшы Дзяржаўны Савет, мы адзначылі з ім, я ўжо маю права раскрыць сакрэт, што мы не будзем нішчыць праект Саюзнай дзяржавы, а наадварот будзем развіваць. Гэта была наша дамоўленасць тры месяцы таму, калі мы пачалі падрыхтоўку да гэтага Вышэйшага Дзяржсавета», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы лічыць, што сёння неабходна сур'ёзна задумацца аб ролі і месцы Саюзнай дзяржавы і яе інстытутаў у агульнай архітэктуры інтэграцыі, каб не атрымалася так, што нейкія інтэграцыйныя напрамкі і структуры больш важныя, чым Саюзная дзяржава. «Лічу, гэтым шляхам трэба ісці, яго паглыбляць. А чым далей, тым складаней будзе, але мы поўныя рашучасці ісці гэтым шляхам», — падкрэсліў беларускі лідар.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, сённяшнія дамоўленасці паміж Беларуссю і Расіяй, якія прапануецца зафіксаваць у шэрагу рашэнняў ВДС і двухбаковых дакументаў, — самае яскравае таму пацвярджэнне.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на асаблівы характар цяперашняга пасяджэння, паколькі яно праходзіць на фоне прыняцця гістарычных рашэнняў. «Я заўсёды аддаваў належнае Расійскай Федэрацыі ў гэтым плане. Мы заўсёды аб гэтым вялі дыялог, і вельмі сімвалічна і знамянальна, што гэты працэс вельмі актывізаваўся з боку Расіі месяц таму», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, гаворачы аб дамоўленасці трох краін развіваць еўразійскую эканамічную інтэграцыю. На думку беларускага лідара, добры штуршок гэтаму даў артыкул Уладзіміра Пуціна, апублікаваны ў газеце «Известия». «Гэта дало добры штуршок, каб усе вызначыліся і выказаліся: як жа будзем рухацца далей», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён з задавальненнем адзначыў, што на працягу некалькіх месяцаў ішла практычная работа і бакі аказаліся гатовымі да падпісання тых гістарычных дакументаў, якія прывядуць да стварэння Еўразійскага саюза.

«З гордасцю магу сказаць, што мы нямала зрабілі для гэтага працэсу і ў рамках будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Усё ж такі будзем шчырымі — гэта не толькі эканамічны саюз Беларусі і Расіі, але і ваенна-палітычны», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што аб гэтым сведчыць і парадак дня цяперашняга пасяджэння ВДС, на якім разглядаюцца пытанні і абароннага, і знешнепалітычнага характару, і сацыяльнай абароненасці грамадзян.

## «КАМП'ЮТАРЫЗАВАНЫ» ЧЫТАЧ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Езярышчанская пасялковая бібліятэка налічвае ў сваіх фондах звыш 14 тысяч кніг і перыядычных выданняў, абслугоўвае штогод больш за тысячу чытачоў. Загадчыца гэтага ўтульнага храма ведаў Святлана Дарожкіна працуе ўжо 12 гадоў і ведае кожнага чытача. Рада ўсім, хто прыходзіць па кнігі і часопісы, каму патрэбны камп'ютарныя паслугі. Адзін з актыўных наведвальнікаў бібліятэкі — 11-гадовы жыхар Езярышча Саша Васільеў (на фотаздымку).**

*Гарадоцкі раён.*

### «Газпрам» заплаціць за 50 працэнтаў акцый «Белтрансгаза» $2,5 млрд

**У адпаведнасці з дагаворам куплі-продажу 50 працэнтаў акцый ААТ «Белтрансгаз», «Газпрам» заплаціць за акцыі $2,5 млрд, паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі ААТ «Газпрам».**

Такім чынам, ААТ «Газпрам» стане ўладальнікам 100 працэнтаў ААТ «Белтрансгаз».

### БЕЛАРУСЬ І РАСІЯ ВЫЙДУЦЬ НА РОЎНАДАХОДНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗ ДА 2014 ГОДА

**Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін на пасяджэнні прэзідыума Кабінета Міністраў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе ўрада Расіі.**

«Беларусь атрымае так званую інтэграцыйную скідку і на працягу некалькіх гадоў, да 2014 года, выйдзе на роўнадаходныя цэны», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Ён нагадаў, што цяпер цана газу для Беларусі складае $244 за 1 тыс.куб.м. У наступным годзе пры сярэдняй планаванай цане прыкладна каля $400 для еўрапейскіх спажыўцоў Беларусь будзе плаціць за газ у першым квартале $164.

Расія таксама прадаставіць Беларусі крэдыт для будаўніцтва АЭС. «Мы дамовіліся, і сёння будуць падпісаны адпаведныя дакументы пра прадастаўленне Беларусі расійскага крэдыту ў аб'ёме да $10 млрд, з выкарыстаннем на працягу 10 гадоў і пагашэннем на працягу 15», — паведаміў Уладзімір Пуцін.

«Прамая лінія»

### ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА БУДЗЕ ВЕСЦІСЯ ПА НОВЫХ УМОВАХ

**По якім дакладным алгарытме пасля Новага года трэба будзе ажыццяўляць кансервацыю незавершанага індывідуальнага будаўніцтва? За які час прыватныя забудоўшчыкі павінны пабудаваць сваё жыллё і ці магчыма павялічыць тэрмін будаўніцтва індывідуальных дамоў? Што новага прадугледжвае заканадаўства пры выдзяленні і адбіранні зямельных участкаў з першых дзён 2012 года?**

**6 снежня,** у аўторак, **з 11.00 да 12.00** у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам **намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Андрэя Анатольевіча ГАЕВА**.

Спецыяліст камітэта раскажа чытачам «Звязды» не толькі пра ўсе нюансы Указа кіраўніка дзяржавы № 520 ад 11 лістапада 2011 года, але і адкажа на пытанні, якія звязаны з рэгістрацыяй зямельных участкаў.

Каб не было нейкіх незразумелых пытанняў на «прамую лінію», адразу трэба зазначыць, што грамадзяне, якія маюць зямельныя ўчасткі ў садаводчых таварыствах, маюць права будаваць там садовыя домікі ці іншыя аб'екты нерухомасці, але не павінны рабіць гэта абавязкова.

**Нумары «прамой лініі»: 8(0172) 292 38 92; 8(017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна задаваць па нумары: 8(017) 287 17 51 з 10.00 да 15.00, або дасылаць на электронны адрас zvyazda@tyt.by.

### БЕЛАРУСКІ РУБЕЛЬ УМАЦОЎВАЕЦЦА ЎЖО ДРУГІ ТЫДЗЕНЬ

**АДЗІНАЯ сесія Беларускай валютна-фондавай біржы дзейнічае болей за месяц. Усе напружана сачылі ўвесь гэты час за тым, што будзе з курсам нацыянальнай валюты, кожны дзень чакалі чаго-небудзь катастрафічнага, абдумвалі, ці патрэбна ізноў бегчы ў абменнік. Аднак нічога страшнага не адбылося.**

Адзінай сенсацыяй фінансавага рынку на гэтым тыдні стала падзенне курса еўра ў адносінах да долара на еўрапейскіх біржах (за адзін еўра давалі толькі 1,33 долара). Прычынай гэтага лічаць занепакоенасць удзельнікаў рынку крызісам суверэнных даўгоў у еўразоне і перспектывамі застою сусветнай эканомікі. На беларускай біржы курс еўра на гэта адрэагаваў патаннеННЕМ на 140 рублёў.

Увогуле, за гэты тыдзень еўрапейская валюта «пахудзела» на 310 беларускіх рублёў. Долар і расійскі рубель таксама «звузіліся» — на 70 і 8 рублёў адпаведна. Аднак долар таннеў без асаблівай ахвоты. Калі еўра і рубель «скідалі» патроху кожны дзень, то долар тры з пяці дзён стаяў на месцы (адзін дзень дык увогуле «адпачываў» з-за свята ў Злучаных Штатах). Такім чынам, долар патаннеў на 0,8%, еўра — на 2,6%, расійскі рубель — на 2,8%. Відавочна тое, што працягваецца тэндэнцыя мінулага тыдня, калі асноўныя валюты патаннелі на 1,2%, 2% і 2,4% адпаведна.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### НЯМЕЦКАЯ ПАЛІЦЫЯ РАЗАГНАЛА АКЦЫЮ ПРАТЭСТУ ЭКОЛАГАЎ

**Нямецкая паліцыя выкарыстала вадамёты, слязісты газ і дубінкі супраць актывістаў экалагічных рухаў, якія пратэстуюць супраць увозу ў іх краіну ядзерных адходаў з Францыі, паведамляе The Local.**

У адказ у паліцэйскіх паляцелі петарды і бутэлькі з фарбай. Хтосьці з дэманстрантаў распыліў у бок вартавых парадку перачны газ. Падчас сутыкненняў чатыры актывісты былі арыштаваны, пяцёра — паранены. Таксама пацярпелі восем паліцэйскіх.

### БРЫТАНСКІЯ БАНКІ РЫХТУЮЦЦА ДА КРАХУ ЕЎРА І ЕЎРАЗОНЫ



**Банкі Вялікабрытаніі не могуць ігнараваць магчымасць выхаду з еўразоны асобных краін, ім неабходна распрацаваць план дзеянняў у надзвычайных абставінах, сказаў кіраўнік банкаўскага аддзела брытанскага Упраўлення па рэгуляванні фінансавай дзейнасці Эндру Бейлі.**

Нягледзячы на тое, што брытанскія банкі маюць на балансе нязначны аб'ём дзяржаблігацый краін еўразоны, яны павінны быць гатовы да горшага, адзначыў Бейлі. «Мы не можам дазволіць сабе расслабіцца ў гэтым пытанні. Як надзорны орган, мы хацелі б убачыць план крэдытных арганізацый краіны на выпадак неспадзяваных наступстваў еўрапейскага пазыковага крызісу», — сказаў прадстаўнік рэгулятара. Пры гэтым Бейлі адзначыў, што яго заява не з'яўляецца прагнозам развіцця сітуацыі ў еўразоне.

### КІРАЎНІК УКРАІНСКАГА НАЦБАНКА АНАНСАВАЎ «МЯККУЮ ДЭВАЛЬВАЦЫЮ» ГРЫЎНІ

**Старшыня Нацыянальнага банка Украіны Сяргей Арбузаў не выключае дэвальвацыі нацыянальнай валюты ў наступным годзе, аднак запэўнівае, што рэзкай яна не будзе.**

«Ваганні могуць быць, паколькі мы залежым ад стану плацежнага балансу. Калі ён палепшыцца, то курс будзе ўмацоўвацца, калі будзе пагаршацца — будзе дэвальвацыя. Але ў любым выпадку гэты працэс не будзе рэзкім», — сказаў Арбузаў украінскай газеце «Сёння». Кіраўнік Нацбанка Украіны пры гэтым адзначыў, што запасы валюты на рахунках банкаў набліжаюцца да 10 млрд долараў. «І гэта небывалая лічба. Усе чакаюць глыбокую дэвальвацыю і хочуць на гэтым зарабіць. Але я хачу сказаць, што яны гэтага не дачакаюцца. Плацежны баланс досыць пазітыўны, яго сярэднямесячны прафіцыт складае каля 100 млн долараў. Таму я думаю, што да канца года курсу нічога не пагражае», — заявіў Арбузаў.

### У РАСІІ ЎВОДЗЯЦЬ УКЛАДЫ БЕЗ ПРАВА АДКЛІКАННЯ

Мінфін РФ падрыхтаваў законапраект, які дазволіць банкам прапанаваць кліентам не толькі тэрміновыя ўклады і ўклады да запатрабавання, але і новыя — уклады без права адклікання. Банкі змогуць замацоўваць у дагаворах з укладчыкамі ўмову, што да заканчэння вызначанага тэрміну грошы кліенту вяртацца не будуць. Згодна з дзейсным заканадаўствам, ва ўкладчыка пакуль ёсць права вярнуць свае сродкі па першым патрабаванні — нават калі гаворка ідзе пра тэрміновы ўклад.

### ЯЙКІ — КЛЮЧ ДА ЗАХАВАННЯ ПАМЯЦІ



**Рацыён, багаты на вітамін В4, выратуе ваш мозг ад старэння, устанавілі навукоўцы з Бостанскага ўніверсітэта. Гэты вітамін можна знайсці ў яйках, курыцы, марской рыбе, бабовых, паведамляе The Daily Mail.**

Даследчыкі высветлілі, што людзі, якія спажываюць В4, лепш спраўляліся з тэстамі на памяць і мелі менш змен у мозгу, звязаных з дэменцыяй. Доктар Рода Ау падкрэслівае: рацыён аказвае прамы ўплыў на стан чалавека. Трэба сказаць, раней навукоўцы даказалі, што так званая Міжземнаморская дыета, якая ўключае рыбу, гародніну, аліўкавы алей, таксама аказвае ахоўны эфект. У цэлым адмыслоўцы рэкамендуюць мужчынам спажываць 550 міліграмаў вітаміну В4 у дзень, а жанчынам — 425 міліграмаў гэтага вітаміну.

«Прамая лінія»

### ВІРУСЫ НЕ ПАДКРАДУЦЦА...

«Гарачая лінія» ў прамым эфіры радыёстанцыі «Мір» пры падтрымцы газеты «Звязда» будзе прысвечана тэме сезонnай захваральнасці на рэспіраторныя хваробы. На любыя пытанні, звязаныя з прафілактыкай, дыягностыкай і лячэннем вострых рэспіраторных вірусных інфекцый і грыпу адкажа **дацэнт кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук, урач вышэйшай катэгорыі Алена Пятроўна КІШКУРНО**.

«Гарачая лінія» адбудзецца **28 лістапада**, у панядзелак, **з 12.15 да 12.45** у студыі радыёстанцыі «Мір» па нумары: **8 (017) 210 14 71**. Пасля **12.45 (да 13.15)** адказы на пытанні можна будзе атрымаць па нумары **8 (029) 618 69 42 (Velcom). Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумары: 8 (017) 287 18 29.**

Адказы на ўсе пытанні будуць надрукаваны ў «Звяздзе».

**РАДЫЁ «МІР» У БЕЛАРУСІ**

| | |
|---|---|
| Мінск | 107,1 FM |
| Брэст | 106,6 FM |
| Віцебск | 101,8 FM |
| Гродна | 104,2 FM |
| Магілёў | 107,8 FM |
| Баранавічы | 98,4 FM |
| Бабруйск | 103,6 FM |
| Пінск | 103,2 FM |
| Салігорск | 104,3 FM |



### «ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ» ПЕРАКЛАДЗЕНЫ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ



Неафіцыйны пераклад тэксту выкананы Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ПРАВІЛЫ ДАРОЖНАГА РУХУ

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзенымі Правіламі вызначаецца парадак руху па дарогах Рэспублікі Беларусь.
2. У дадзеных Правілах прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і паняцці:

Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь падрыхтаваў пераклад на беларускую мову «Правілаў дарожнага руху». Праўда, пакуль гэты пераклад неафіцыйны — ён выкананы ў рамках навукова-даследчай і доследна-канструктарскай працы па стварэнні базы звестак «Слоўнік юрыдычных тэрмінаў на беларускай, рускай і англійскай мовах». Азнаёміцца і спампаваць сабе ПДР на беларускай мове можна з сайта Pravo.by. Таксама варта заўважыць, што Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі просіць карыстальнікаў беларускамоўнай версіі правілаў дасылаць канструктыўныя заўвагі і прапановы па паляпшэнні зместу перакладу на электронную пошту portal@ncpi.gov.by.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.11.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 8 670,00 |
| ▼ 1 еўра | 11 530,00 |
| 1 латвійскі лат | 16 531,60 |
| 1 літоўскі літ | 3 340,78 |
| 1 чэшская крона | 445,16 |
| 1 польскі злоты | 2 559,18 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 275,00 |
| 1 украінская грыўня | 1 081,69 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,5788 |
| 10 UAH | 39,3982 |
| 10000 BYR | 36,2142 |
| EUR | 42,0251 |

БЕЛАРУСБАНК

*Выгодные предложения по вкладам в белорусских рублях от Беларусбанка!*

**Прием денежных средств на новые срочные банковские вклады в белорусских рублях «ГОСТИНЕЦ» и «КЛАССИК ПЛЮС» с 28 ноября 2011 года.**

**«ГОСТИНЕЦ» — процентная ставка – 51%, срок хранения – 2 месяца.**

**«КЛАССИК ПЛЮС» — процентная ставка до 53,8%, срок хранения – 1,5 года.**

Удобные условия.
Подробности на сайте Беларусбанка
http://www.belarusbank.by
и у консультантов в структурных подразделениях.

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by
Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | Лот № 1. Автомобиль МАЗ 53371, 1987 года выпуска, гос. № ВЕ2726; Лот № 2. Автомобиль МАЗ 5551, 2001 года выпуска, гос. № ВЕ6459; Лот № 3. Автомобиль МАЗ 5551, 1992 года выпуска, гос. № ВЕ4408; Лот № 4. Автомобиль МАЗ 5551, 2001 года выпуска, гос. № 3210 АА-2. |
| **Собственник (владелец) имущества** | УРСЧП «Стройфорум», г. Витебск, ул. К. Павлова, д. 2 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. К. Павлова, д. 2 |
| **Стоимость имущества** | Лот № 1 — 16 138 800 рублей с учетом НДС; Лот № 2 — 39 505 200 рублей с учетом НДС; Лот № 3 — 11 863 200 рублей с учетом НДС; Лот № 4 — 23 726 400 рублей с учетом НДС. |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. Правды, д. 32 21 декабря 2011 года в 11.30 |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области, 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 304, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел/факс. (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович тел. (80212) 49 13 40. |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 20.12.2011. Минимальная величина первого шага — 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |



АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Нерудпром» (продавец) проводит открытый аукцион**

по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: **Минская область, Минский р-н, севернее д. Захаричи,** в составе:

- **Лот № 1:** корпус промывки (здание специализированное иного назначения инв. № 600/С-59848), об.пл. 2211,7 кв.м. Начальная цена с НДС – 2 362 800 000 бел.руб. Площадь земельного участка – 0,2241 га;
- **Лот № 2:** корпус вторичного дробления (здание специализированное иного назначения инв. № 600/С-59846), об.пл. 1284,8 кв.м. Начальная цена с НДС – 1 447 200 000 бел.руб. Площадь земельного участка – 0,2240 га;
- **Лот № 3:** корпус первичного дробления (здание обрабатывающей промышленности иного назначения инв. № 600/С-59856), об.пл. 381 кв.м. Начальная цена с НДС – 512 400 000 бел.руб. Площадь земельного участка – 0,90 га. Объекты обременены договорами аренды.

**Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

**Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.**

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **28.12.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.12.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

## Рыгор Рапота зацверджаны на пасадзе дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы

**Рыгор Рапота зацверджаны на пасадзе дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы тэрмінам на 4 гады, перадае БЕЛТА.**

На гэту пасаду яго назначылі ўчора на пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета. Рыгор Рапота пачне выконваць абавязкі з 15 снежня. Як адзначылі ўдзельнікі пасяджэння, прафесійны вопыт Рыгора Рапоты дасць магчымасць надаць новы імпульс рабоце саюзных органаў, зрабіць яе больш эфектыўнай і адпаведнай сучасным рэаліям. У сувязі з завяршэннем тэрміну знаходжання на займаемай пасадзе Павел Барадзін вызвалены ад абавязкаў дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы. За шматгадовую работу на гэтай пасадзе яму аб'яўлена падзяка ВДС. Дарэчы, гэта першая падзяка Вышэйшага Дзяржсавета за ўвесь час яго дзейнасці.

## МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БЕЛАРУСІ БУДЗЕ НЕСЦІ АДКАЗНАСЦЬ ЗА АБГРУНТАВАНАСЦЬ УЗРОЎНЮ ЦЭН НА ЛЯКАРСТВЫ

**Гэта прадугледжана ў падпісаным 24 лістапада кіраўніком дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам Указе № 547 «Аб унясенні дапаўнення і змянення ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 лютага 2011 г. № 72».**

Дакумент прыняты ў мэтах забеспячэння рацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў пры закупцы лекавых сродкаў айчыннай вытворчасці. У адпаведнасці з указам № 72 адпускныя цэны на лекавыя сродкі, якія выпрабляюцца арганізацыямі краіны, рэгулююцца Міністэрствам эканомікі па пераліку, што вызначаецца Саветам Міністраў, шляхам устанаўлення іх гранічнага максімальнага ўзроўню.

Цяпер у Міністэрстве аховы здароўя ствараецца Дэпартамент фармацэўтычнай прамысловасці, на які ўскладаюцца функцыі правядзення адзінай дзяржаўнай палітыкі ў галіне вытворчасці фармацэўтычнай прадукцыі. Пры перадачы Міністэрству аховы здароўя паўнамоцтваў па рэгуляванні цэн на лекавыя сродкі міністэрства будзе несці адказнасць за абгрунтаванасць узроўню гэтых цэн, а таксама за рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў пры закупцы лякарстваў і фінансавае становішча фармацэўтычных прадпрыемстваў краіны.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ З 50-ГОДДЗЕМ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў дзяржаўнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт» з 50-годдзем з дня заснавання ВНУ.**

Гэта ўнікальная міждзяржаўная ВНУ ажыццяўляе падрыхтоўку інжынерных кадраў для Беларусі і Расіі, з'яўляючыся відавочным доказам паспяховага фарміравання адзінай адукацыйнай прасторы, адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Стаўшы буйным вучэбным і навукова-даследчым цэнтрам, ваш універсітэт упэўнена ідзе наперад і ўносіць важкі ўклад у вырашэнне задач інавацыйнага развіцця рэальнага сектара эканомікі. Звыш 30 тыс. яго выпускнікоў плённа працуюць на прамысловых прадпрыемствах, у органах дзяржаўнага кіравання і навуковых арганізацыях Беларусі і Расіі», — гаворыцца ў віншаванні.

Прафесіяналізм і наватарскі пошук калектыву ўніверсітэта даюць магчымасць яму праводзіць фундаментальныя і прыкладныя даследаванні, ствараць і ўкараняць у вытворчасць сучасныя тэхналогіі, выхоўваць выдатных спецыялістаў і дастойных грамадзян. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што і ў далейшым дзякуючы новым дасягненням у навуковай і адукацыйнай дзейнасці калектыў прымножыць добрую славу роднай ВНУ.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# «АДНАГРУПНІКІ МОГУЦЬ ПРАЦЯГВАЦЬ СУСТРАКАЦЦА, ТАНЦОРЫ — ТАНЦАВАЦЬ...»



**Заўтра ўступае ў сілу абноўлены Закон «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» — дакумент, які зараз актыўна абмяркоўваецца. Пра новаўвядзенні і іх адпаведнасці нормам міжнароднага права размаўляем з начальнікам упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Генпракуратуры Беларусі Паўлам РАДЗІВОНАВЫМ.**

***— Павел Ульянавіч, якія прынцыпова новыя палажэнні з'явіліся ў новай рэдакцыі закона?***

— Сярод новаўвядзенняў — уключэнне ў спіс масавых мерапрыемстваў так званых флэшмобаў. З апошнімі («маўклівымі акцыямі». — **Н.Д.**) мы сутыкнуліся летам гэтага года. Відавочна, калі актывісты заклікаюць праз інтэрнэт нявызначаную колькасць асоб прыйсці ў канкрэтнае месца для выказвання сваіх сацыяльна-палітычных патрабаванняў, — гэта не што іншае, як масавае мерапрыемства. Незалежна ад таго, якім словазлучэннем яго назавуць моладзевыя групоўкі.

***— А калі былыя аднагрупнікі, якія даўно не бачыліся, дамовяцца праз сацыяльныя сеткі сустрэцца на Кастрычніцкай плошчы альбо танцоры запросяць аматараў брэйк-дансу прыйсці паглядзець на іх імправізаванае выступленне — гэта будзе лічыцца масавым мерапрыемствам?***

— Дзяржава не асноўвае сваю дзейнасць на абсурдзе. Безумоўна, падобныя сустрэчы ніколі не будуць ацэнены як масавыя мерапрыемствы. Аднагрупнікі могуць працягваць без боязі сустракацца, танцоры — танцаваць.

***— Наколькі я ведаю, заканадаўца ўпершыню ў пералік сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для арганізацыі масавых мерапрыемстваў, уключыў інтэрнэт.***

— Інтэрнэт становіцца адной з асноўных крыніц інфармацыі для сучаснага грамадства. Таму не дзіўна, што практычна кожная дзяржава думае аб механізмах яго рэгулявання. Беларусь не выключэнне. Так, у адпаведнасці з папраўкамі ў закон, забараняецца аб'яўляць, у тым ліку ў інтэрнэце, аб даце, месцы і часе правядзення масавага мерапрыемства да атрымання афіцыйнага дазволу на яго правядзенне. У выпадку парушэння арганізатарам парадку арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства, ён прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасці. Пасля чаго на працягу года пазбаўляецца права выступаць у ролі арганізатара масавых мерапрыемстваў. Апрача таго, забараняецца прыцягваць да ўдзелу ў масавых мерапрыемствах людзей за ўзнагароджанне.

Асабіста я не лічу, што папраўкамі ўносяцца нейкія надзвычай жорсткія патрабаванні ў дачыненні да арганізатараў масавых мерапрыемстваў. Бо ўсе яны накіраваны на забеспячэнне бяспекі людзей падчас правядзення розных масавых мерапрыемстваў. Так, законапраект дазваляе супрацоўнікам органаў унутраных спраў, якія ахоўваюць грамадскі парадак, пры наяўнасці падазрэнняў праводзіць асабісты надгляд грамадзян і іх рэчаў. Калі чалавек адмаўляецца ад надгляду, яго маюць права не пусціць на мерапрыемства. Забаронены таксама ўдзел у масавым мерапрыемстве асоб у стане алкагольнага ап'янення, людзей у масках. Такая пазіцыя зараз у многіх еўрапейскіх дзяржавах. І гэта абсалютна правільна. Калі чалавек хавае твар ці знаходзіцца нападпітку і хоча заявіць публічна свае патрабаванні, грамадства па меншай меры мае права падазраваць яго ў магчымасці праяўлення супрацьпраўных дзеянняў.

***— Павел Ульянавіч, а чым была выклікана неабходнасць прыняцця паправак у закон аб масавых мерапрыемствах?***

— Гэты закон дзейнічае ў нашай краіне ўжо дастаткова даўно. І Генпракуратура, якая ажыццяўляе нагляд за выкананнем заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, вымушана канстатаваць, што на тэрыторыі Беларусі перыядычна дзейнічае група грамадзян, якая праяўляе асаблівыя формы прававога нігілізму. Прадстаўнікі асобных палітызаваных груп на працягу некалькіх гадоў поўнасцю ігнаруюць элементарныя нормы заканадаўства. У прыватнасці, арганізатары масавых мерапрыемстваў нават не абцяжарваюць сябе падачай заяўкі на правядзенне гэтых мерапрыемстваў. За апошнія два гады я не памятаю ні адной акцыі, якая праводзілася палітызаванымі групамі з падачай папярэдняй заяўкі. Многія ў апошні час прызвычаіліся тлумачыць такія парушэнні тым, што ўлада ўсё роўна не дае дазволу. Але гэта няпраўда. Нават у тых выпадках, калі мясцовыя органы ўлады забараняюць правядзенне масавых мерапрыемстваў, такая забарона павінна быць у адпаведнасці з законам матываваная. Калі адмова не задавальняе арганізатараў масавага мерапрыемства, яны могуць яе абскардзіць ва ўстаноўленым законам парадку. І ў нас ёсць прававыя інстытуты, якія могуць аднавіць законнасць у выпадку парушэння. Але я не ведаю такіх выпадкаў, калі адмовы абскарджваліся і прадстаўнікі апазіцыйных структур спрабавалі б задзейнічаць усе прававыя механізмы для адстойвання сваёй праўды.

Сёлета прадстаўнікі асобных палітызаваных фарміраванняў пайшлі яшчэ далей. Маніпулюючы нормамі закона Беларусі аб мясцовых і рэспубліканскіх сходах, гэтыя лідары спрабуюць надаць выгляд законнасці сваёй проціпраўнай дзейнасці. У адпаведнасці з законам Беларусі аб мясцовых і рэспубліканскіх сходах, для правядзення народных сходаў неабходна ініцыятыва не менш як 10 працэнтаў ад колькасці асоб, якія пражываюць на канкрэтнай тэрыторыі. Цалкам відавочна, што збор подпісаў жыхароў асобных пад'ездаў некалькіх дамоў (у прыватнасці, якія пражываюць непадалёку ад плошчы Бангалор) не можа стаць прававой асновай для правядзення народнага сходу. Такія дзеянні недапушчальныя. Тым больш, гэтыя людзі папярэджваліся аб магчымай адказнасці ў выпадку правядзення несанкцыянаванага масавага мерапрыемства. Тым не менш, наўмысна ішлі на парушэнне закона і былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Хачу падкрэсліць, што ні ў адным выпадку арганізатары падобных масавых мерапрыемстваў не задумаліся аб забеспячэнні бяспекі людзей.

***— Ці паўплывалі падзеі за мяжой на прыняцце новаўвядзенняў?***

— Безумоўна, дзяржава не можа не звяртаць увагі на тое, што адбываецца ў Францыі, Лондане, Італіі, ЗША, Егіпце, дзе незаконныя акцыі абарочваюцца чалавечымі ахвярамі. І быць ліберальным да тых, хто ставіць пад пагрозу жыццё іншых людзей, мы не маем намеру. Мы аналізуем тое, што адбываецца ў іншых дзяржавах, бо не хочам вучыцца на сваіх памылках. Лепш выкарыстаць вопыт тых, хто ўжо праз гэта прайшоў. Але і падзеі ў Беларусі, як я ўжо казаў, даюць падставы для прыняцця больш жорсткіх мер, якія будуць рэгламентаваць парадак правядзення масавых мерапрыемстваў.

***— Наколькі суровы закон у еўрапейскіх краінах у дачыненні да ўдзельнікаў незаконных масавых мерапрыемстваў у параўнанні з нашым?***

— Заканадаўства еўрапейскіх краін утрымлівае дастаткова жорсткія меры адказнасці за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. У прыватнасці, усе дзяржавы падзяляюць адказнасць у залежнасці ад наступстваў праведзенай незаконнай масавай акцыі. Мы таксама пайшлі па шляху заходніх дэмакратый і ўстанавілі ў папраўках больш суровую адказнасць за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, у выніку якіх мелі месца цяжкія наступствы — напрыклад, прывялі да гібелі чалавека.

***— Законапраект выклікаў вялікі рэзананс у грамадстве. Некаторыя лічаць, што ўнесеныя папраўкі парушаюць правы грамадзян на мірныя сходы, гарантаваныя як Канстытуцыяй Беларусі, так і базавымі нормамі міжнароднага права. Наколькі нормы новага Закона адпавядаюць прынцыпам і нормам міжнароднага права?***

— Папраўкі ў закон аб масавых мерапрыемствах ніякім чынам не падрываюць прынцыпаў міжнароднага права, якія рэгламентаваны Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека і Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Кожная дзяржава можа абмяжоўваць права на правядзенне масавых мерапрыемстваў вызначанымі патрабаваннямі ў мэтах забеспячэння бяспекі сваіх грамадзян. Што і зрабіла Рэспубліка Беларусь, калі прыняла закон аб масавых мерапрыемствах. Магу з упэўненасцю сказаць, што канстытуцыйнае права грамадзян на правядзенне мірных сходаў ніякім чынам не абмяжоўваецца. І тыя людзі, якія зараз скептычна ставяцца да новаўвядзенняў, з часам прыйдуць, пераканаbuilt, да выніку, што дзеянні заканадаўцы накіраваны перш за ўсё на забеспячэнне бяспекі жыцця і здароўя грамадзян, нашых дзяцей, у тым ліку і будучых удзельнікаў масавых мерапрыемстваў.

**Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.**

### У ТЭМУ

**Ігар ГАЛУБІЦКІ, начальнік упраўлення канстытуцыйнага заканадаўства Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Беларусі:** *«Новаўвядзенні ў закон не павінны выклікаць насцярожанасці і непрыемных чаканняў з боку тых, хто праводзіў і праводзіць масавыя мерапрыемствы ў адпаведнасці з заканадаўствам. А вось тым, хто парушаў патрабаванні, варта непакоіцца».*

**Анатоль КУЛЯШОЎ, міністр унутраных спраў:** *«Папраўкі ў закон аб масавых мерапрыемствах абсалютна своечасовыя. Яны скіраваны не на парушэнне правоў і свабод грамадзян, а на іх выразнае і няўхільнае выкананне».*

**Анатоль ГЛАЗ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:** *«З усёй адказнасцю заяўляю, што беларускі закон аб масавых мерапрыемствах нічым не горшы за еўрапейскія і амерыканскія. А што тычыцца мер адказнасці, то наш закон калі не найбольш, то адзін з самых ліберальных. Нашых апанентаў не задавальняе, што чалавек, прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за несанкцыянаваныя паводзіны ці парушэнне закона аб масавых мерапрыемствах, на працягу года не можа выступаць. Гэтая норма ўтрымліваецца практычна ў кожным заканадаўстве еўрапейскай краіны. Да прыкладу, заканадаўства ў ФРГ найбольш жорсткае і дакладнае. Там адмову можа атрымаць арганізатар правядзення масавага мерапрыемства проста таму, што ён нейкім чынам па сваёй лаяльнасці не задавальняе ўладу».*

**Открытое акционерное общество «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (сокращенное наименование: ОАО «Белсчеттехника») сообщает, что внеочередное общее собрание акционеров состоится 08 декабря 2011 года в 13.00 по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, д. 8, ком. 405 (актовый зал).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении результатов закрытой подписки на акции дополнительного выпуска ОАО «Белсчеттехника».
2. Об утверждении решения о выпуске дополнительных акций ОАО «Белсчеттехника».
3. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Белсчеттехника» (утверждение новой редакции Устава Общества).

Начало регистрации в день проведения и по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров в 12.30.

С материалами повестки дня внеочередного общего собрания акционеров можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, д. 8, к. 1 (приемная) в рабочие дни (понедельник–пятница) в течение 7 дней до проведения собрания с 11.00 до 12.00.

Списки акционеров для регистрации участников внеочередного общего собрания составляются на 02 декабря 2011 г.

Участникам собрания при себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

**Телефон для справок: (8 017) 295 23 68.**

УНН 100064838. *Совет директоров.*

## Беларусь прымае міжнародны турнір па барацьбе з прызавым фондам у 60 тысяч долараў

**Сёння ў сталічным Палацы спорту пройдзе 18 міжнародны турнір па грэка-рымскай барацьбе памяці Алега Караваева.**

Ужо другі год запар турнір змяніў фармат — спаборніцтвы праводзяцца «сценка на сценку». Такім чынам высвятляецца пераможца ў камандным заліку. Для гледачоў і балельшчыкаў гэта відовішчнае шоу, для барцоў — новы цікавы вопыт. Летась турнір памяці Алега Караваева ўпершыню прайшоў у такім фармаце. А першым яго пераможцам стала каманда Беларусі.

Сёлета ў спаборніцтвах возьмуць удзел каманды Беларусі, (Грузіі, Казахстана, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расія, Украіны, ЗША. Сярод удзельнікаў — чэмпіёны свету і Еўропы. Напрыклад, каманду Грузіі прадставіць алімпійскі чэмпіён Квертэлі. Старшыня федэрацыі барацьбы Юрый Чыж паведаміў, што прызавы фонд турніру — 60 тысяч долараў, а расходы на яго правядзенне склалі каля 800 мільёнаў рублёў.

— Я за тое, каб зноў выйграла каманда Беларусі і прызавы фонд дастаўся нашым барцам. Але ствараць нашай камандзе асаблівыя ўмовы, «працаваць» з суддзямі мы не будзем. Уся барацьба павінна ісці на спартыўным дыване, — сказаў Юрый Чыж.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### Абзац

**◢ Мінск упэўнена лідзіруе па ўзроўні налічанай сярэдняй зарплаты. Гэты паказчык у кастрычніку наблізіўся да 3-мільённага рубяжу і склаў Br2992 тыс. Як сведчыць статыстыка, на другой пазіцыі кастрычніцкага зарплатнага рэйтынгу — Мінская вобласць (Br2319,8 тыс), а на апошняй — Брэсцкая (Br2006,6 тыс).**

◢ Гродзенскія мытнікі ў пункце пропуску «Прывалка» выявілі цыгарэты на Br107,5 млн у фуры з бульбай. Партыя беларускай бульбы перавозілася ў Калінінград праз Літву, машынай кіраваў грамадзянін РФ. Пад мяхамі былі выяўлены кантрабандныя каробкі з цыгарэтамі расійскай вытворчасці. Пачаты адміністрацыйны працэс.

### Поўны абзац

**◢ У Буда-Кашалёўскім раёне майстар машынатрактарнага парка аднаго з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў скраў з поля 18 тон курынага памёту, што належыць гэтаму прадпрыемству. Скрадзенае ацэнена ў 720 тысяч рублёў. 24 лістапада ў дачыненні да падазраванага заведзена крымінальная справа. Выкрадзенае не забіралі, мера спынення не абіралася.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Падпіска-2012

## Дзень падпісчыка прайшоў на Гомельшчыне

В А ЎСІХ АДДЗЯЛЕННЯХ паштовай сувязі зараз арганізаваны асобныя працоўныя месцы, дзе без чаргі можна падпісацца на любімае выданне. Гамяльчанка Марыя Асадчая «Звязду» выбрала ўпершыню. Яе прывабіла тое, што наша газета для стасункаў з чытачамі выкарыстоўвае менавіта беларускую мову. А яшчэ яна ўспомніла, што выданне выпісваў і любіў яе бацька. Будзем спадзявацца, што мы знайшлі яшчэ адну верную чытачку. Між іншым, для ўсіх, хто ў гэты дзень падпісаўся на газеты і часопісы, супрацоўнікамі «Гомельаблпошты» ў Гомельскім цэнтральным аддзяленні паштовай сувязі №50 была арганізавана бяспройгрышная латарэя. Наша новая падпісчыца Марыя Мікалаеўна выбрала ў якасці прыза кніжку журналіста «Звязды» Валянціны Доўнар «Праз каханне».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**



Марыя Асадчая прымае ўдзел у бяспройгрышнай латарэі.

16 ноября 2011 г. № 22-11

## РЕШЕНИЕ БОБРУЙСКОГО РАЙОННОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА

*О внесении изменений и дополнений в приложение 2 к решению Бобруйского районного исполнительного комитета от 19 января 2011 г. № 2-7*

В соответствии с решением Бобруйского районного Совета депутатов от 26 июня 2008 г. № 9-16 «О некоторых вопросах создания в процессе разгосударствления и приватизации районной коммунальной собственности открытых акционерных обществ и владения и распоряжения находящимися в районной коммунальной собственности акциями», на основании предложения управления сельского хозяйства и продовольствия райисполкома, как органа управления, Бобруйский районный исполнительный комитет РЕШИЛ:

Внести в приложение 2 к решению Бобруйского районного исполнительного комитета от 19 января 2011 г. № 2-7 «Об утверждении плана приватизации объектов, находящихся в районной коммунальной собственности, на 2011-2013 годы и перечня открытых акционерных обществ, созданных в процессе приватизации государственной собственности, акции которых, находящиеся в районной коммунальной собственности, подлежат продаже в 2011-2013 годах» изменения и дополнения, изложив его в новой редакции (прилагается).

*Председатель* *М. В. Шалковский*
*Управляющий делами* *А. И. Емельянов*

*«Приложение 2
к решению Бобруйского районного исполнительного комитета
19.01.2011 № 2-7
(в редакции решения Бобруйского районного исполнительного комитета
16.11.2011 № 22-11)*

**ПЕРЕЧЕНЬ**

**открытых акционерных обществ, созданных в процессе приватизации государственной собственности, акции которых, находящиеся в районной коммунальной собственности, подлежат продаже в 2011-2013 годах**

| Наименование объекта районной коммунальной собственности, подлежащего приватизации | Доля собственности Бобруйского района, % | Способ приватизации |
|---|---|---|
| Управление сельского хозяйства и продовольствия райисполкома* | | |
| 2011 год | | |
| Открытое акционерное общество «Агрокомбинат «Бобруйский» | 99,99 | Продажа с аукциона |
| 2012 год | | |
| Открытое акционерное общество «Совхоз Киселевичи» | 99,65 | Продажа с аукциона |

*В случае, если акции не будут проданы в запланированном году, они будут предлагаться в продаже с аукциона в последующем году».

**Узденский районный исполнительный комитет 29 декабря 2011 года в 10-00 в зале заседаний исполкома (4-й этаж), расположенного по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков, в 11-00 — открытый аукцион по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов.**

На аукционные торги на право заключения договоров аренды выставляются следующие участки с начальной ценой:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Узденский райисполком | Земельный участок: г. Узда – ул. Карла Маркса | 0,0094 | 625650100003001501 | 3 380 220 | 1 494 250 |

Целевое назначение участка по улице Карла Маркса — для установки и обслуживания торгового павильона. Участок свободен от строений. Инженерные коммуникации: имеется возможность подведения к газоснабжению, водоснабжению, водоотведению. Срок аренды – 50 лет.

На аукционные торги по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов выставляются следующие участки с начальной ценой:

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | агрогородок Озеро, Озерский с/Совет | ул. Васильковая, уч. №11 | 0,1500 | 625682508601000753 | 85 000 000 | 1 114 580 |
| Лот №2 | агрогородок Озеро, Озерский с/Совет | ул. Дружная, уч. №13 | 0,1500 | 625682508601000755 | 80 000 000 | 1 114 580 |
| Лот №3 | агрогородок Озеро, Озерский с/Совет | ул. Дружная, уч. №18 | 0,1500 | 625682508601000757 | 80 000 000 | 1 114 580 |
| Лот №4 | агрогородок Озеро, Озерский с/Совет | ул. Березовая, уч. №20 | 0,1500 | 625682508601000754 | 80 000 000 | 1 114 580 |
| Лот №5 | агрогородок Озеро, Озерский с/Совет | ул. Дружная, уч. №24 | 0,1500 | 625682508601000756 | 80 000 000 | 1 114 580 |

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания жилого дома.

К участкам имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению и водоснабжению.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3602631002502 финансового отдела Узденского райисполкома в филиале 606 ОАО «Беларусбанк» г. Дзержинска, МФО 153001514, УНП 600203994, код платежа на право заключения договоров аренды 04002, код платежа по продаже земельных участков в частную собственность 04901. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: г.Узда, ул. Советская, 22, второй этаж, кабинет 210, с 8-00 до 17-00 по рабочим дням с 28 ноября по 23 декабря 2011 года включительно.

Заключительная регистрация – с 8.30 до 9.55 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: www.uzda.minsk-region.by, либо по телефонам (801718) 55404,54705, 55342.

**ОДО «Арниус-М»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже имущества,
расположенного по адресу: г. Гомель, м-н Мельников луг:**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Незавершенное законсервированное капитальное строение – здание многоквартирного жилого дома, двухэтажное, фундамент бетонный, стены кирпичные, кровля совмещенная, общей площадью строения согласно ведомости тех. характеристик 1601,9 кв.м, общая площадь согласно проекта 2246,0 кв.м, инвентарный номер 350/U-89764, расположенное на земельном участке площадью 0,7058 га, железобетонное ограждение площадью 668 кв.м. | 1 500 000 000 | 150 000 000 |

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, тел. (8029) 621 22 36, 655 33 68.

Продавец: ОДО «Арниус-М».

— Першы момант адзначу наконт аднапакаёвай кватэры. Тое, што вы заключылі дагавор, гэта добра, але... Кватаранты падаткі за вас плаціць не павінны. Падаткі дзяржаве кожны плаціць самастойна. Кватаранты даюць вам мільён у месяц плюс за камунальныя паслугі і плюс плата за падатак. Гэтая агульная сума і будзе вашым даходам. І цяпер ужо з гэтага даходу трэба будзе плаціць падаткі. У заканадаўстве ёсць норма, калі забараняецца аплачваць падаткі за кошт сродкаў іншых юрыдычных ці фізічных асоб. Справа ў тым, што калі ваш агульны даход ад здачы жылля будзе большы за 500 базавых велічынь (гэта сёння 17,5 мільёна рублёў), тады неабходна будзе падаваць дэкларацыю ў падатковую інспекцыю па выніках года, а потым плаціць падаткі з даходаў па плоскай шкале ў памеры 12 працэнтаў. Што тычыцца другой кватэры, дзе зарэгістраваны малады спецыяліст, то ваша сям'я мае пэўную падатковую льготу. У гэтым выпадку зарэгістраваная дзяўчына павінна даць вам дакумент аб тым, што яна з'яўляецца маладым спецыялістам па накіраванні. Пасля афармлення адпаведных папер вам могуць зрабіць нават пераразлік аплачаных падаткаў.

***— Яшчэ ў нашай сям'і ёсць кватэра ў Бараўлянах. Уласнікам яе з'яўляецца мой бацька — грамадзянін Расіі. На маё імя на гэтую кватэру існуе генеральная даверанасць. У ёй зарэгістравана мая знаёмая (для працаўладкавання), аднак там ніхто не жыве і больш ніхто не зарэгістраваны. Знаёмая мне нічога не плаціць, бо яна жыве ў іншым месцы. У гэтым выпадку я павінна плаціць падаткі?***

— Павінна. Дагавор найму памяшкання прадугледжвае тое, што вы атрымліваеце за гэта даход. Вам трэба заключыць іншы дагавор — аб бязвыплатным карыстанні жылым памяшканнем.

***— Дзе заключаецца гэты новы дагавор?***

— Як і першы — у жыллёва-эксплуатацыйнай службе па месцы знаходжання кватэры.

***— У мяне ёсць пытанне і па іншых падатках. У 2009 годзе мае бацькі пазычылі мне грошы на набыццё аўтамабіля. Потым, ужо ў 2010 годзе, пазычылі яшчэ — на куплю другой машыны. Я з'яўляюся ўласнікам гэтых машын. Ці неабходна мне даваць справаздачу дзяржаве аб тым, дзе я ўзяла грошы на набыццё аўтамабіляў і калі?***

— Калі падатковая інспекцыя вырашыць у вас папрасіць падатковую дэкларацыю, то вы атрымаеце па пошце адпаведнае паведамленне. Калі гэта адбудзецца — ніхто вам не скажа. Можа — увогуле ніколі.

***— Сама я самастойна не павінна нешта несці (дакументы) у падатковую інспекцыю?***

— Не. Такая дэкларацыя аб даходах і маёмасці будзе запаўняцца вамі толькі тады, калі ў падатковых органаў узнікнуць да вас пытанні.

***— А ў якіх выпадках падобныя пытанні да мяне могуць узнікнуць?***

— На любых падставах. У нашай краіне існуе пяць дзяржаўных органаў, якія маюць права патрабаваць ад фізічнай асобы прадастаўлення дэкларацыі аб даходах і маёмасці. Хто ведае, хто з іх зацікавіцца вашымі даходамі?

### СТАЎКІ «КВАТЭРНЫХ» ПАДАТКАЎ У НАСТУПНЫМ ГОДЗЕ ПАВЯЛІЧАЦЬ БОЛЬШ ЧЫМ УДВАЯ

☎***— Пытанне тычыцца нядаўняй заявы мэра Мінска аб магчымым павелічэнні падатку за здачу жылля ў сталіцы. Ці магчыма гэта сапраўды і ў якіх памерах? Магчыма, павелічэнне падаткаў, якое плануецца, будзе выкарыстоўвацца толькі для дарагой жыллёвай нерухомасці, ці новыя стаўкі будуць дзейнічаць для любога жылля, што здаецца ў арэнду? Ці існуе падобнае права павялічваць узровень падаткаў у іншых рэгіёнах?***

**Аляксандр Бурак,** *г. Лепель.*

— Такое права прадастаўлена аблсаветам і Мінскаму гарадскому савету. Законапраектам на 2012 год прадугледжана павелічэнне базавых фіксаваных ставак падаходнага падатку пры здачы жылля ўнаём. Цяпер фіксаваныя стаўкі такога падатку падлічваюцца пакуль кратна ў базавых велічынях. Зараз у праекце прадугледжана выкарыстоўваць гэтыя стаўкі ў абсалютных лічбах — у рублях. Існуюць толькі абмежаванні гэтых ставак, памер якіх можа вагацца ад адной лічбы да другой. Сёння кожны рэгіён, кожная вобласць па сваіх гарадах самастойна прымае рашэнне аб памерах гэтых ставак. Канчатковы памер такіх ставак яшчэ ўдакладняецца мясцовымі ўладамі. Сёння, напрыклад, вызначаецца, што ў Мінску фіксаваная стаўка падаходнага падатку за кожны пакой, які здаецца ўнаём, будзе ў межах ад 75 тысяч да 300 тысяч рублёў. Такое павелічэнне ставак тлумачыцца павелічэннем сумы даходу, якую атрымліваюць асобы, што здаюць жыллё. Гэта звязана з павелічэннем курса долара. Так, раней, пры здачы кватэры да 200 долараў у месяц сума даходу пры курсе долара 3 тысячы рублёў складала 600 тысяч рублёў. А вось пры курсе долара прыкладна 8700 рублёў даход складае ўжо 1 млн 740 тысяч рублёў. Сума даходу павялічылася амаль у тры разы, пры гэтым базавыя фіксаваныя стаўкі падаходнага падатку прапануецца павялічыць толькі ў 2,1 раза. Тут яшчэ раз адзначу, што канкрэтны памер ставак падаходнага падатку будзе вызначаны рашэннямі абласных Саветаў дэпутатаў (Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў) з улікам памеру даходаў, які атрымліваюць грамадзяне ў тым ці іншым рэгіёне ад здачы ўнаём жылля. Напрыклад, у Брэсце плануецца, што стаўка падаходнага падатку з фізічных асобаў у фіксаваных сумах за здачу жылых памяшканняў (за кожны пакой) будзе ў межах ад 30 да 150 тысяч рублёў, у Баранавічах і Пінску — у межах ад 30 да 113 тысяч рублёў, а ў іншых населеных пунктах — у межах ад 30 да 75 тысяч рублёў.

☎***— У мяне ўзнікла такая сітуацыя. Два месяцы таму памерла мая бабуля. Яе кватэра ў сталіцы па завяшчанні афармлена на маё імя. Па законе ў спадчыну гэтую кватэру я атрымаю толькі праз паўгода, а зараз яна стаіць пустая. Ці маю я права цяпер афарміць у кватэру кватарантаў?***

**Таццяна Цемашкова,** *г. Мінск.*

— Не, не маеце. Ніякіх дакументаў на гэтую кватэру ў вас пакуль няма. Для заключэння дагавора з кватарантам у ЖЭС неабходна прынесці дакумент на кватэру. А такога дакумента ў вас няма.

***— Атрымліваецца, што добрая кватэра ў Мінску будзе 6 месяцаў заставацца пустой...***

— Так, гэта закон. За гэты час могуць адшукацца іншыя сваякі, іншае завяшчанне ці яшчэ нейкія моманты. Без дакументаў на кватэру здаваць унаём яе нельга.

**Сяргей КУРКАЧ.**

г. ВИТЕБСК 27.12.2011

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ
### ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 8. | Здание растворобетонного узла с деревянной галереей, расположенное по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, промышленная зона. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 252/С-10275 (здание специализированное обрабатывающей промышленности), трехэтажное кирпичное, частично деревянное, общая площадь 360,9 кв.м, объем 2016 куб.м, фундамент бетонный, перекрытие — железобетонные плиты, крыша рулонная. Земельный участок: с кадастровым номером 241800000009002107, площадь 0,0438 га для содержания и обслуживания растворобетонного узла, сроком аренды 20 лет. Использование – под объект административного, производственного, коммунально-хозяйственного назначения. | 35 000 | 35 000 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail: fondvitebsk@tut.by.**

ПРОДАВЕЦ: Витебское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Витебскэнерго», контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 475299.

**Условия продажи недвижимости:** ввод объекта в эксплуатацию в течение 1,5 лет с момента заключения договора купли-продажи; осуществление предпринимательской деятельности на приобретенном объекте не менее 3-х лет с момента ввода объекта в эксплуатацию и создание не 2-х рабочих мест; запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи.

**Условия пользования земельным участком:** заключение победителем аукциона с Новополоцким горисполкомом договора аренды и в двухмесячный срок после его заключения осуществление государственной регистрации прекращения права Витебского республиканского унитарного предприятия электроэнергетики «Витебскэнерго» на земельный участок и возникновение права на земельный участок; получение победителем аукциона, в случае изменения назначения недвижимого имущества (растворобетонный узел), в установленном порядке разрешения Новополоцкого горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

А**укцион состоится «27» декабря 2011 г.** в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 26.12.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 27.12.2011** с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на **расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495**.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11.03.2010 № 342. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведение аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 12 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

## ФЭН-ШУЙ ГАРАСКОП

**НЯДЗЕЛЯ, 27 ЛІСТАПАДА**

Не лепшы час як для вырашэння практычных задач, асабліва звязаных з грашыма або неабходнасцю плённа супрацоўнічаць з навакольнымі, так і для паездак, зносін, нават адпачынку — залішняе напружанне будзе перашкаджаць і сканцэнтравацца, і расслабіцца.

**ПАНЯДЗЕЛАК, 28 ЛІСТАПАДА**

Сёння не варта займацца пытаннямі, якія выходзяць за рамкі дробнай руціны. Прынамсі, прасоўвацца да складаных (ды і ўсіх астатніх) мэтаў сёння лепш як мага больш зразумелымі шляхамі, па дарозе ўсяляк пазбягаючы любых высвятленняў адносін і абыходзячы вострыя вуглы.

**АЎТОРАК, 29 ЛІСТАПАДА**

Не фарсіруйце падзеі, не мітусіцеся і не хапайцеся за вырашэнне пытанняў, якія трэба спакойна «раскласці па паліцах».

**СЕРАДА, 30 ЛІСТАПАДА**

Дзень абяцае поспех і ўменне знаходзіць агульную мову з навакольнымі. Вельмі спрыяльна займацца дробнымі бытавымі справамі.

**ЧАЦВЕР, 1 СНЕЖНЯ**

Актыўны і эмацыянальна яркі дзень. Хоць на падтрымку калег сёння асабліва разлічваць не даводзіцца. Ёсць небяспека ўпасці ў ілюзіі.

**ПЯТНІЦА, 2 СНЕЖНЯ**

Дзень адзначаны абуральнай непрактычнасцю, шчодра запраўленай агульным лёгкім хаосам і схільнасцю ўліпаць у гісторыі.

**СУБОТА, 3 СНЕЖНЯ**

Сёння не лішнім будзе праявіць максімум акуратнасці падчас працы са складанай тэхнікай, асабліва электрычнай, паколькі яна можа ламацца, а то і нарабіць нейкай шкоды.

07 декабря 2011 г. в 11.00 состоится внеочередное общее **СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1»**.

Повестка дня:

1) О совершении сделок Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Начало регистрации в 10.30.

*УНП 200215539*

## Дзве даты — 26 лістапада

**Сусветны дзень інфармацыі.**

**1930 год** — нарадзіўся (г. Орша) Уладзімір Караткевіч, вядомы беларускі пісьменнік. Аўтар раманаў «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Каласы пад сярпом тваім», «Сівая легенда» і іншых. У жанры гістарычнага дэтэктыва напісаныя «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі». Аўтар паэтычных зборнікаў «Вячэрнія ветразі», «Матчына душа», «Быў.Ёсць.Буду». Па яго творах пастаўлены мастацкія фільмы, тэле- і радыёспектаклі, оперы. У прозе ўзняў шырокія пласты нацыянальнай гісторыі, стварыў адметныя характары, раскрыў багаты духоўны свет герояў і звязаў іх асабісты лёс з лёсам Бацькаўшчыны. Выступаў у абарону беларускай мовы, культуры, помнікаў архітэктуры і прыроды. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1983), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984). Памёр у 1984 годзе.



**1894 год** — нарадзіўся Норберт Вінер, амерыканскі матэматык, які паклаў пачатак кібернетыцы. Па асабістым меркаванні вучонага, кібернетыка — гэта навука аб кіраванні, сувязях і апрацоўцы інфармацыі ў тэхніцы, жывых арганізмах і чалавечым грамадстве. За складаным вызначэннем хаваецца яшчэ больш цяжкая для ўспрымання навуковая тэорыя. Гэта і зразумела — бо Норберт быў вундэркіндам: у 7 гадоў чытаў Дантэ і Дарвіна, у 11 скончыў сярэднюю школу, у 14 — ВНУ, а ў 18 гадоў стаў доктарам філасофіі Гарвардскага ўніверсітэта. Выхадзец з Беларусі Леа Вінер, які на зыходзе XIX стагоддзя перабраўся ў ЗША, мог ганарыцца сваім сынам. Норберт пайшоў далей бацькі — паважанага прафесара кафедры славянскіх моў і літаратуры Гарвардскага ўніверсітэта. Тым не менш сваю першую фундаментальную працу пад назвай «Кібернетыка» былы вундэркінд Норберт Вінер завяршыў толькі ва ўзросце 54 гадоў. Падобная вытрымка выдатным чынам характарызуе вялікага навукоўца, які вечна сумняваецца ва ўсім. Зараз навуковая спадчына Вінера нябачна працуе на кожнага, хто садзіцца за камп'ютар.

## Цытата дня

*«Чалавек ясна выкладае сваю пазіцыю, калі ім валодае думка, але яшчэ ясней — калі ён валодае думкай».*

**Вісарыён Бялінскі (1811—1848), рускі літаратурны крытык, публіцыст.**

## Усміхнемся

Мужык зайшоў у цягнік на Адэсу, бачыць — зусім месцаў няма. Вырашыў адну штуку выкінуць. Ходзіць і прыгаворвае:

— Нічога, усё адно яе злаўлю!

— Каго?

— Ды кобра з торбы ўцякла...

Пасажыраў як ветрам здула, мужык улёгся і заснуў. Раніцай прачынаецца і пытае ў правадніка:

— Хутка Адэса?

— Ды якая там Адэса? Учора нейкі ідыёт кобру выпусціў, дык вагон адчапілі — стаім, шукаем.

☺

**Учора ўвечары сантэхнік Сідараў у 20.23 стаў уладаром свету, але праз гадзіну быў змушаны ісці ў краму за падаўжэннем паўнамоцтваў.**

☺

— Пятро, ты зарплату калі атрымаеш?

— Сказалі, што разлічацца 31 лістапада.

— Дрэнна!

— Раней ніяк...

— Якое раней ці пазней! У лістападзе, Пятро, — 30 дзён!

☺

**Дзяўчына — хлопцу, пасля вячэры:**

**— Было смачна?**

**Хлопец:**

**— Так, вельмі!**

**— Выдатна! Схадзі мне за шакаладкай — і атрымаеш супрацьяддзе!**



# ЗДАРОЎЕ ШКОЛЬНІКАЎ — НЕ ТОЛЬКІ МЕДЫЦЫНСКАЯ ПРАБЛЕМА

**З заклікам да больш шчыльнага супрацоўніцтва з Міністэрствам адукацыі звярнуўся да ўдзельнікаў IX з'езда беларускіх педыятраў першы намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ:**

— Наша работа з Міністэрствам адукацыі не павінна абмяжоўвацца толькі кантролем за выкананнем санітарна-гігіенічных нарматываў і арганізацыяй харчавання. Мы з вамі павінны дыктаваць, як навучаць дзяцей, каб не цярпела пры гэтым іх здароўе. Медыцынская навука павінна даць адказ на пытанне, як зменшыць нагрузкі, як скарэктаваць вучэбныя праграмы, як арганізаваць навучальны працэс, каб зменшыць негатыўны ўплыў школы на здароўе падрастаючага пакалення.

Як паведаміла ў сваім выступленні на з'ездзе **галоўны педыятр Міністэрства аховы здароўя Алена Нявера,** калі захваральнасць дзяцей удалося стабілізаваць, то здароўе падлеткаў працягвае пагаршацца. Хранічная паталогія нарастае па меры прасоўвання дзіцяці па «школьнай лесвіцы». Колькасць школьнікаў, якія маюць III і IV групы здароўя, павялічваецца. Сёння дзень хранічныя захворванні маюць 15,3 працэнта ад агульнай колькасці дзяцей. Сярод школьнікаў гэты паказчык дасягае 19 працэнтаў, а сярод падлеткаў 15-17 гадоў — 22 працэнты.

Цяжка не пагадзіцца з думкай, што здароўе школьнікаў — гэта не толькі медыцынская, але, хутчэй, медыка-сацыяльная праблема. На думку спецыялістаў, ад унутрышкольнага асяроддзя здароўе дзяцей залежыць на 20-30 працэнтаў. Аднак пад увагу трэба браць не толькі ўмовы знаходжання дзяцей, добрае асвятленне, «правільную» вучнёўскую мэблю, але і рэжым арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, аб'ёмы матэрыялу, які вывучаецца, формы яго падачы, якасць і рэгулярнасць харчавання, псіхалагічны клімат у класе... На жаль, даводзіцца канстатаваць, што сёння дзеці пастаўлены ў такія ўмовы, калі ім не прыходзіцца выбіраць. **Такім чынам працоўны дзень старшакласнікаў, якія хочуць прадоўжыць навучанне ў ВНУ, складае 10-12 гадзін. Алена Невера расказала, што ва ўзроставай групе 15-17 гадоў сярод хранічных захворванняў лідзіруюць міяпія, хранічны гастрыт і скаліёз.**

Доўгі час у структуры дзіцячай захваральнасці інфекцыйныя захворванні стабільна займалі другое месца, услед за захворваннямі органаў дыхання. Але цяпер інфекцыйныя захворванні займаюць толькі шосты радок. Сярод дзяцей рэгіструюцца толькі адзінкавыя выпадкі інфекцыйных захворванняў, якія кантралююцца прышчэпкамі. На другое месца ў структуры захваральнасці дзіцячага насельніцтва выйшлі захворванні вачэй. На трэцім месцы знаходзяцца захворванні органаў стрававання, а на чацвёртым — траўмы і атручэнні.

Алена Нявера адзначыла, што захваральнасць на цукровы дыябет расце апошняе дзесяцігоддзе ва ўсім свеце. Не стала выключэннем і Беларусь. За апошнія 8 гадоў захваральнасць на дыябет вырасла ва ўзроставай групе ад 0 да 14 гадоў аж на 46 працэнтаў. Больш за тое, беларускія медыкі сутыкнуліся ўжо і з цяжкімі ўскладненнямі, што развіваюцца ў хворых на дыябет дзяцей.

Дзіцячая смяротнасць зніжаецца ва ўсіх узроставых групах, акрамя групы 15-17 гадоў: сярод падлеткаў назіраецца нават некаторы рост смяротнасці. Звязана гэта з ростам захворванняў нервовай сістэмы і ўплывам знешніх прычын. У структуры смяротнасці падлеткаў 15-17 гадоў траўмы і атручэнні займаюць 79 працэнтаў. На жаль, але трэцюю частку трагічных выпадкаў складаюць суіцыды. Увагі заслугоўвае той факт, што 30 працэнтаў усіх зваротаў у Цэнтры сяброўскага стаўлення да падлеткаў звязаны з псіхалагічнымі праблемамі, з якімі падлеткі сутыкаюцца ў сваёй сям'і, ў школе, у стасунках з сябрамі, аднакласнікамі і педагогамі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Краіна здароўя
Выпуск № 56 (292)

Інфарм-укол

## Зніжаем шкоду ад камп'ютара і мабільніка

**Працяглае знаходжанне за камп'ютарам здольнае нанесці шкоду цэнтральнай нервовай сістэме, апорна-рухальнаму апарату і зроку дзяцей. Псіхолагі таксама папярэджваюць аб наркатычным уплыве камп'ютарных гульняў. Пры гэтым чым меншы ўзрост, тым большым можа быць шкоднае ўздзеянне камп'ютара.**

| УЗРОСТ ДЗІЦЯЦІ | ЧАС ЗА КАМП'ЮТАРАМ |
|---|---|
| *5-6 гадоў* | *7 хвілін* |
| *6-7 гадоў* | *10 хвілін* |
| *вучні пачатковай школы* | *15 хвілін* |
| *вучні 5-7 класаў* | *20 хвілін* |
| *вучні 8-9 класаў* | *25 хвілін* |
| *вучні 10 класаў* | *40 хвілін* |
| *вучні 11 класаў* | *не больш за 3 гадзіны.* |

Даследаванні паказваюць, што працяглыя і частыя размовы па мабільным тэлефоне прыводзяць да пэўных адхіленняў у стане здароўя нават дарослых (павышэнне артэрыяльнага ціску, галаўны боль, парушэнне сну і памяці, узнікненне тэлефоннай залежнасці, трывога і пагаршэнне самаадчування). Пры частым карыстанні мабільнымі тэлефонамі ў дзяцей адзначаюцца пагаршэнне памяці, зніжэнне ўвагі і разумовых здольнасцяў, раздражняльнасць, парушэнне сну, сутаргавыя рэакцыі. Магчымыя і больш сур'ёзныя аддаленыя наступствы. **А таму неабходна правільна карыстацца мабільным:**

- Доступ дзяцей да сотавай сувязі павінен быць максімальна абмежаваны.
- Варта пазбягаць размоў па мабільным у транспарце, падчас руху, там, дзе няма ўстойлівага сігналу.
- Аддаваць перавагу кантактам у фармаце SMS.
- Сумарны час кантактаў не павінен перавышаць 15 хвілін у дзень.
- Кожная размова не павінна перавышаць 1 хвіліну, мінімальны перапынак паміж размовамі — 5 хвілін.
- Не варта насіць мабільны ў кішэнях, на папрузе, лепей — у сумцы.
- Не трэба падносіць тэлефон да вуха, пакуль абанент не адказаў.
- Ноччу варта выключаць або класці мабільны на адлегласць не менш за 1 м ад галавы.
- Падчас размовы трымайце апарат толькі за ніжнюю частку. Трымаючы тэлефон у кулаку, вы павялічваеце магутнасць апраменьвання апарата, а значыць, і галавы на 70 працэнтаў.

## Не размаўляйце з дзецьмі «па-дзіцячы»

**У апошнія гады рэзка вырасла колькасць дзяцей з моўнымі праблемамі. Найбольш уразлівы ў гэтым сэнсе перыяд — ад 1 года да 5-ці. Своечасовая карэкцыйная педагагічная дапамога здольная поўнасцю нармалізаваць моўнае недаразвіццё да паступлення ў школу.**

Паводле слоў валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ, сярод прычын затрымкі моўнага развіцця вылучаюць моўныя парушэнні ў блізкіх сваякоў; шэраг неспрыяльных фактараў, якія ўздзейнічалі на мозг плода падчас родаў, у першыя гады жыцця дзіцяці або ва ўнутрывантробным перыядзе; адлучэнне дзіцяці ад бацькоў, асабліва ад маці; няправільнае агульнае і маўленчае выхаванне, а менавіта недастатковая або залішняя ўвага да дзіцяці з боку бацькоў.

**1.** З першых дзён жыцця дзіцяці бацькі павінны назіраць не толькі за з'яўленнем у яго тых ці іншых формаў стасункаў, але і за псіхаматорным развіццём (мышачным тонусам, паводзінамі, рухальнымі, зрокавымі і слыхавымі рэакцыямі).

**2.** Дзяцей з фактарамі рызыкі паталогіі псіхічнага і моўнага развіцця павінны кансультаваць дзіцячы неўролаг, псіхіятр, лагапед.

**3.** Дзіцяці патрэбны пастаянны цесны кантакт з маці — часцей бярыце яго на рукі.

**4.** Заахвочвайце любыя спробы размаўляць.

**5.** Размаўляйце з дзіцем павольна, кароткімі фразамі, не пераходзьце на «дзіцячую» мову.

**6.** Штодня чытайце малому кнігі.

**7.** Не папраўляйце дзіця, проста паўтарыце фразу правільна.

**8.** Заўсёды адказвайце на ўсе дзіцячыя пытанні, нават калі яны задаюцца шмат разоў запар.

**9.** Не параўноўвайце дзіця з іншымі дзецьмі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# У ЛЯЧЭННІ ХРАПУ БЕЛАРУСКІЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ АБЫШЛІ СВАІХ ЕЎРАПЕЙСКІХ КАЛЕГ

**Тры новыя хірургічныя методыкі лячэння храпу засвоілі спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра оталарынгалогіі. Дзве з іх — першымі ў Еўропе.**

Па словах **дырэктара РНПЦ оталарынгалогіі Людмілы МАКАРЫНАЙ-КІБАК,** сам па сабе храп — гэта не хвароба, а сімптом такога дастаткова сур'ёзнага захворвання, як сіндром абструктыўнага апноэ сну. У людзей з такім сіндромам, калі яны спяць, спыняецца дыханне, што можа прывесці да многіх сур'ёзных праблем — напрыклад, рэзка павышаецца рызыка сардэчна-сасудзістых захворванняў. Больш за тое, чалавек можа падчас сну нават памерці. Статыстыкі, колькі беларусаў церпяць ад апноэ сну, пакуль што няма, але спецыялісты ўжо працуюць над зборам інфармацыі.

— І мы ўжо бачым, што такіх людзей дастаткова многа, — паведаміла журналістам Людміла Макарына-Кібак. — Штодня да нас у цэнтр звяртаюцца ў сярэднім пяць чалавек, для якіх храп ператварыўся ў сапраўдную праблему. Многія з іх маюць залішнюю вагу. Безумоўна, храп лячыўся ў нашым цэнтры і раней, але нядаўна мы першымі ў Еўропе (кажу гэта з гонарам) укаранілі дзе новыя методыкі — устанаўліваем сваім пацыентам імпланты мяккага нёба і трымальнікі пад'язычнай косці, якія фіксуюць корань языка. Такім чынам, язык падчас сну не западае і чалавек спакойна дыхае. Устаноўлена ўжо 12 імплантаў мяккага нёба.

Як запэўнівае Людміла Макарына-Кібак, зараз у цэнтры засвоены ўсе методыкі па паляпшэнні слыху, што існуюць у свеце. Немалаважна, што высокатэхналагічныя віды аператыўных умяшанняў укараняюцца таксама і ў абласных цэнтрах. Фактычна ў Беларусі ўжо ліквідавана чарга на кахлеарную імплантацыю.

Сутнасць гэтай методыкі  наступная. У вушную ракавіну ўжыўляецца электрод, а звонку — за вушной ракавінай — замацоўваецца спецыяльнае прыстасаванне. Яно ўспрымае гукавую інфармацыю і перадае яе ў выглядзе электрычных сігналаў праз электрод у галаўны мозг. Такім чынам адбываецца раздражненне гукавога цэнтра за кошт гукавых хістанняў звонку. Але гэта яшчэ не азначае, што глухі чалавек пачынае чуць таксама, як і здаровы. Самы працаёмкі і адказны этап — гэта пасляаперацыйная рэабілітацыя, галоўная мэта якой навучыць разбірацца ў пачутых гуках і, што вельмі важна, навучыцца размаўляць. Гэты высокатэхналагічны від медыцынскай дапамогі можа быць рэалізаваны толькі камандай спецыялістаў, у якую ўваходзяць урачы-сурдолагі, сурдапедагогі, псіхолагі і іншыя. З 2000 па 2007 год у нашай краіне былі выкананы толькі 23 кахлеарныя імплантацыі, а з 2007 года і па сённяшні дзень — 268. Сёння сістэма кахлеарнай імплантацыі — самая дасканалая сістэма дапамогі людзям, для якіх свет гукаў недасягальны.

Яшчэ адна з засвоеных методык — косная імплантацыя сістэмай ВАНА. Размова ідзе пра аказанне дапамогі дзецям з прыроджанымі парокамі развіцця вонкавага і сярэдняга вуха, у якіх недаразвітая вушная ракавіна або слыхавы праход і якім не падыходзяць звычайныя слыхавыя апараты паветранай праводнасці.

— На сённяшні дзень мы маем магчымасць устанавіць такім людзям спецыяльныя апараты коснай праводнасці, праз якія чалавек пачынае чуць. Гукавы працэсар ВАНА мацуецца да мініяцюрнай імплантаванай часткі, што размяшаецца на косці за вушной ракавінай. Перадача гуку да слыхавога нерва адбываецца напрамую па косці чэрапа, без задзейнічання слыхавога праходу. Можам мы дапамагчы і людзям, у якіх у выніку прыроджанай анамаліі або траўматычных пашкоджанняў адсутнічаюць вушныя ракавіны. Напрыклад, нам давялося аперыраваць дзяўчынку, у якой падчас пажару згарэлі вонкавыя вушныя ракавіны. Раней, каб дапамагчы такім людзям, з рэбернай дугі браўся храсток і за некалькі этапаў з яго фарміравалася вушная ракавіна — калі больш паспяхова, а калі і менш. У свеце і ў нас і сёння выкарыстоўваецца такая методыка, яна мае права на жыццё. У той жа час мы ўжо ўстанавілі пацыентам 5 штучных вушных ракавін, — паведаміла Людміла Макарына-Кібак. — У месцы звычайнага размяшчэння вушных ракавін пацыенту спачатку ўстанаўліваюцца металічныя апоры, на якія мацуюцца сіліконавыя вушныя ракавіны. Яны знешне зусім не адрозніваюцца ад звычайных вушных ракавін, на іх можна разгледзець нават «сасудзікі», а іх колер падбіраецца пад колер скуры чалавека. Для таго, каб у далейшым самім выраблять такія штучныя вушныя ракавіны, мы для свайго цэнтра за спонсарскія грошы закупляем лабараторыю па вырабе штучных вушэй. З'яўленне аналагічных лабараторый плануецца таксама ва ўсіх абласных цэнтрах, праўда, у больш аддаленай перспектыве — з 2012 па 2015 гады.

Усяго за 9 месяцаў гэтага года ў РНПЦ оталарынгалогіі было выканана 3 289 хірургічных умяшанняў. Больш як трэць з іх адносяцца да складаных і высокатэхналагічных.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АДАПТУЕМСЯ ДА ЗМЕНЫ СЕЗОНА



**Як уплывае на нас сезонны фактар? Тут і змена біярытмаў, і сюрпрызы надвор'я, і харчовы рацыён. Але людзі часта самі вінаваты ў развіцці абвастрэння. Давайце разгледзім, чаму яно адбываецца. Восенню светлавы дзень скарачаецца, пасля сямі вечара ўжо цямнее. Біярытмы запавольваюцца, а на працу ўставаць па-ранейшаму трэба рана — а шостай—сёмай гадзіне... Чалавек недасыпае, адчувае сябе не ў сваёй талерцы. У выніку ў арганізме адбываецца збой, і чалавек захворвае...**

Медыкі раяць: **у ПЕРШУЮ** чаргу, паспрабуйце наладзіць **СОН**. Для гэтага арганізоўвайце вячэрнія прагулкі — часам вельмі прыемна прагуляцца па восеньскай свежасці... Класціся спаць варта не пазней за адзінаццаць гадзін вечара: тады да раніцы вы паспееце выспацца. Калі ёсць цяжкасці з засынаннем, піце заспакаяльныя травы, выкарыстоўвайце методыкі расслаблення.

Яшчэ адзін эфектыўны сродак — спорт. Вазьміце за правіла бегаць па раніцах ці вечарах у адзін і той жа час — і пераход на «асеннi рэжым» дасца вам значна лягчэй. Калі бегаць вам па нейкіх прычынах не ўдаецца, паспрабуйце выконваць хаця б самыя простыя фізічныя практыкаванні, не забывайце пра ранішнюю зарадку!

**2. НАДВОР'Е**

У кастрычніку звычайна ўжо даволі холадна, а мы ўсё ніяк не забудзем пра лета. Тэмпература 7 градусаў цяпла, а мы ходзім без галаўнога ўбора, апранаем лёгкі плашчык і замест шаліка намотваем на шыю тонкую хусцінку... Не дзіўна, што хранічны бранхіт неўзабаве дае аб сабе ведаць.

«Апранайцеся цяплей!» — рэкамендуюць урачы. Калі тэмпература на вуліцы менш як дзесяць градусаў цяпла, неабходна надзяваць на шыю шалік або кашнэ, а на галаву — шапку або берэт... З вопраткі падыдзе цёплая асенняя куртка або дэмісезоннае паліто.

Не забудзьцеся і пра абутак! У такую пару часта льюць дажджы, таму вашы асеннія туфлі могуць хутка прамокнуць. Мужчынам варта насіць чаравікі на тоўстай падэшве, жанчынам — асеннія боты або паўбоцікі.

**3. ІМУНІТЭТ**

Большасць абвастрэнняў хранічных хвароб узнікае на фоне паніжанага імунітэту і сезонных інфекцый. Прастудзіліся або падхапілі ВРВІ — і пайшло...

Як толькі на вуліцы стала холадна, пачынайце прымаць прэпараты для павышэння імунітэту. Падыдуць любыя агульнаўмацавальныя сродкі: вітаміны, настойкі жэньшэню або эхінацыі і да т.п. Перад выхадам з дому варта мазаць ноздры аксалінавай маззю — тады меншай будзе рызыка заражэння вірруснай інфекцыяй.

**4. ХАРЧАВАННЕ**

Прычынай абвастрэння часта з'яўляецца няправільны рацыён. Увосень так і цягне з раніцы выпіць гарачай кавы, а да гэтага з'есці каларыйную булачку. Між тым, гэта сапраўдная «бомба» для сардэчна-сасудзістай сістэмы! Акрамя таго, восенню з'яўляецца мноства спакус. Вакол прылаўкі з памідорамі, яблыкамі, балгарскім перцам, вінаградам. Людзі ядуць свежыя садавіну і гародніну літаральна кілаграмамі, а гэта супрацьпаказана пры некаторых захворваннях (гастрыце, язве, панкрэатыце і інш.).

Медыкі папярэджваюць: нават калі вы на той момант адчуваеце сябе добра, гэта не значыць, што любая празмернасць у харчаванні сыдзе вам з рук. Сістэматычнае ўжыванне кавы і высокакаларыйных прадуктаў людзьмі з павышаным артэрыяльным ціскам можа справакаваць раптоўны крыз. Не варта злоўжываць і свежай агароднінай і садавіной, супакойваючы сябе тым, што ваша язва або панкрэатыт знаходзяцца ў стадыі рэмісіі. Гэта небяспечна абвастрэннем!

**5. ДЭПРЭСІІ І НЕЎРОЗЫ**

Усе мы ведаем, што восенню абвастраюцца нервова-псіхічныя захворванні. Адна з прычын у тым, што нам не хапае сонечнага святла, неабходнага для выпрацоўкі гармонаў, якія адказваюць за добры настрой. Нават псіхічна здаровыя людзі ўвосень пачынаюць хандрыць.

Перш за ўсё, не забывайцеся пра вітамінныя комплексы і агульнаўмацавальныя сродкі! Яны дапамогуць вам справіцца з нестабільным душэўным станам.

А яшчэ — знайдзіце сабе цікавае хобі, часцей хадзіце ў госці, на розныя мерапрыемствы, больш кантактуйце — і асенняя дэпрэсія абыдзе вас бокам!

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

### Дарэчы

**Для актывізацыі ахоўных сіл арганізма**

- прыгатуйце натурпрадукт: вазьміце 0,5 кг лісця алоэ, прапусціце яго праз мясарубку разам з такой жа колькасцю ядраў грэцкіх арэхаў, заліце ўсё гэта 1,5 шклянкі мёду. Дайце пастаяць сумесі 3 дні ў цёмным цёплым месцы. Ужывайце 3 разы на дзень па 1 ст. лыжцы пасля яды.
- запасіцеся фітанцыдамі: паўгалоўкі часнаку дробна пасячыце з палавінкай лімона, а затым заліце 2 шк. кіпеню і пакіньце на суткі. Захоўвайце ў халадзільніку. Кожную раніцу трэба ўжываць нашча па 1 ст. лыжцы.
- загартоўвайце насаглотку: горла, нос, вушы бяруць на сябе асенні шквал вірусаў. Загадзя пачніце прывучаць іх да пахаладання: аблівайце ступні халаднаватай вадой і піце ваду, паступова зніжаючы яе тэмпературу.

## Вадзіцель і «пешаход»



г. Мінск

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Што спрыяе школьным траўмам?

Траўмаванне школьнікаў, як правіла, адбываецца ў выніку парушэння дысцыпліны або правілаў паводзін у спартзалах, на спартыўных пляцоўках, з-за бескантрольнасці з боку настаўнікаў ці няспраўнасці спартыўных канструкцый. У малодшым школьным узросце актыўнасць дзяцей часта звязана з неабдуманасцю ўчынкаў, акрамя таго, з прыхільнасцю да «стралялак», гульняў з вострымі прадметамі, гульняў на вышыні. У сярэднім і старэйшым школьным узросце дзеці пераацэньваюць свае магчымасці, у іх з'яўляецца цікавасць да гераізму, прыгод. Пазбегнуць траўмаў у дзяцей школьнага ўзросту можна пры ўмове павышэння адказнасці школы за бяспеку дзяцей, вытрымлівання мераў бяспекі, пабудовы праграмы заняткаў з такім разлікам, каб дзеці не былі пакінуты без нагляду.

Доктар адкажа

### ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ...

**Да канца месяца дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**28 лістапада** — галоўны эпідэміёлаг Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.

**29 лістапада** — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра пульманалогіі і фтызіятрыі Вікторыя Якаўлеўна КРАЛЬКО.

**30 лістапада** — дырэктар Цэнтра экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя Аляксандр Юр'евіч СТАЛЯРОЎ.

**«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25**

**28 лістапада** — загадчык аддзялення медыцынскай рэабілітацыі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Людміла Мікалаеўна РЫБІНА.

**29 лістапада** — намеснік загадчыка філіяла № 2 Мінскай ЦРБ «Заслаўская гарадская бальніца» Наталля Міхайлаўна ПЕРШУКОВА.

**30 лістапада** — урач-інфекцыяніст інфекцыйна-метадычнага кабінета Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Юлія Валер'еўна СУРЫКАВА.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА С УСЛОВИЯМИ по продаже неиспользуемого объекта, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине

**Аукцион состоится 29 декабря 2011 г. в 12.10 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», тел.: 8 (0222) 311185, 223375, 229022.

Продавец неиспользуемого имущества – РУП «Могилевское отделение БелЖД», тел.: 8 (0222) 392665, 392422.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342 «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 11 декабря 2009 г. № 622».

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни в фонде «Могилевоблимущество» с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная со дня публикации извещения. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **26 декабря 2011 г.** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **29 декабря 2011 г.** с 10.00 до 10.50.

| № лота | Сведения о неиспользуемом имуществе | | | Информация о земельном участке | | Сумма задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена, базовых величин* | Площадь, га | Срок аренды, лет | |
| 1 | Здание неустановленного назначения (бывший жилой дом), одноэтажное, стены – блоки, облицованные кирпичом, 60,0 кв.м | Могилевская обл., Кричевский р-н, Лобковичский с/с, 0,2 км северо-западнее дер. Ивановка | 1 | 0,0965 | 36 | 35,0 |

** Начальная цена продажи входящего в состав лота неиспользуемого имущества определяется исходя из размера базовой величины, установленного законодательством на дату проведения аукциона.*

Обязательные условия для покупателя:

- осуществление покупателем предпринимательской деятельности на отчуждаемом объекте; создание не менее одного рабочего места;

- открытие производства не позднее одного года с момента приобретения объекта;

- запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

Условие для победителя аукциона в отношении земельного участка, право заключения договора аренды которого входит в состав лота – в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Кричевского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий два года.

Задаток перечисляется до момента подачи заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет, подавшие организатору аукциона в определенный в извещении срок заявление с приложением (предъявлением) необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и получившие билеты участников аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

негосударственным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии; копии учредительных документов юридического лица без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Прием заявлений со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Дата и время регистрации заявления указываются организатором аукциона в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

Срок заключения договора купли-продажи неиспользуемого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат.

Оплата за неиспользуемое имущество осуществляется денежными средствами в белорусских рублях по безналичному расчету без предоставления рассрочки в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

| № лота | 1. | 2. |
|---|---|---|
| Предмет аукциона (месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер) | Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Гагарина, 29 кадастровый номер 425850100002000683 | Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Гагарина, 43 кадастровый номер 425850100002000690 |
| Площадь, га | 0,1499 | 0,1487 |
| Вещное право | Частная собственность | Частная собственность |
| Цель | Строительство и обслуживание жилого дома | Строительство и обслуживание жилого дома |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 24 630 369 | 24 433 194 |
| Сумма задатка, руб. | 2 463 037 | 2 443 319 |

Аукцион состоится **26 декабря 2011 г. в 11.00** по адресу: 231513, г. Щучин, пл. Свободы, 11 (здание Дома Советов, 2-й этаж, малый зал районного Совета депутатов).

Заключительная регистрация участников аукциона **26 декабря 2011 г. с 8.30 до 10.30.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | 1. | 2. |
|---|---|---|
| Предмет аукциона (месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер) | Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Гагарина, 39 кадастровый номер 425850100002000688 | Земельный участок, расположенный по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Гагарина, 41 кадастровый номер 425850100002000689 |
| Площадь, га | 0,1438 | 0,1415 |
| Вещное право | Аренда на 99 лет | Аренда на 99 лет |
| Цель | Строительство и обслуживание жилого дома | Строительство и обслуживание жилого дома |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 11 814 033 | 11 625 074 |
| Сумма задатка, руб. | 1 181 403 | 1 162 507 |

Аукцион состоится **26 декабря** 2011 г. в **11.30** по адресу: 231513, г. Щучин, пл. Свободы, 11 (здание Дома Советов, 2-й этаж, малый зал районного Совета депутатов).

Заключительная регистрация участников аукциона **26 декабря 2011 г. с 8.30 до 10.30.**

1. Организатор аукциона – Щучинский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), г. Щучин, пл. Свободы, 11; контактные телефоны комиссии:

председатель – 801514 27044, заместитель председателя – 801514 27064, секретарь – 801514 28152.

2. Прием заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе производится с **29 ноября 2011 г. по 21 декабря 2011 г. включительно** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кабинет 54 землеустроительной службы райисполкома.

3. Для участия в аукционе гражданин, в установленный в извещении о проведении аукциона срок, подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить по результатам аукциона, а также копию квитанции о внесении задатка.

Кроме того, в комиссию гражданином представляется – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования.

При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию или организацию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет организатора аукциона № 3604527000016 ЦБУ филиала № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Щучин, код 752, получатель Щучинский районный исполнительный комитет, УНП 500066573.

5. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка: внести плату за земельный участок, предоставляемый в частную собственность, или плату за право заключения договора аренды; возместить затраты за изготовление архитектурного проекта, за проектно-изыскательские землеустроительные работы, за государственную регистрацию; возместить расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Трастбанк

Банк, заснаваны на даверы

# Закрытае акцыянернае таварыства «Трастбанк»:

# ЗВЫШ 17 ГАДОЎ ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ НА ФІНАНСАВЫМ РЫНКУ БЕЛАРУСІ

### Дасье «Звязды»

**ЗАТ «Трастбанк» было зарэгістравана ў Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь 9 лістапада 1994 года. Цяпер акцыянерамі банка з'яўляюцца беларускія кампаніі, ён адносіцца да ліку нешматлікіх фінансавых устаноў нашай краіны, створаных выключна за кошт беларускага капіталу.**

**ЗАТ «Трастбанк» абслугоўвае карпаратыўных і прыватных кліентаў. Банк валодае ўсімі ліцэнзійнымі паўнамоцтвамі. Нарматыўны капітал складае больш за 26 млн EUR, што дае банку права ажыццяўляць дзейнасць па прыцягненні грашовых сродкаў насельніцтва.**

### Цэнтральны апарат ЗАТ «Трастбанк»

- **г. Мінск,** вул. Ігнаценкі, 11, тэл.: +375 17 203 24 67, факс +375 17 228 52 31
- **г. Мінск,** вул. Старажоўская, 8, тэл.: +375 17 209 47 71, факс +375 17 209 47 51

ЗАТ «Трастбанк», ліцэнзія № 14 выдадзена Нацыянальным Банкам Рэспублікі Беларусь 13.11.2008 года.




Алег ШЭЛЕСТ, начальнік ЦБУ 01/01 г. Брэст:

## «КРЭДЫТАВАННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА — ПРЫЯРЫТЭТНЫ НАПРАМАК ДЗЕЙНАСЦІ БАНКА»

Крэдытаванне насельніцтва з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці банка. Лідзіруючыя пазіцыі ў гэтым кірунку ўпэўнена займае Брэсцкі рэгіён і ЦБУ г. Брэста, дзе асабліваe, беражлівае стаўленне да крэдытаатрымальнікаў і сяброўскія адносіны з усімі партнёрамі банка.

Тое, што ў Брэсце вельмі добра развіты гэты напрамак, склалася гістарычна, а таксама дзякуючы намаганням дружнага калектыву.

Асабліва актуальным стаў унікальны спажывецкі крэдыт на тэрыторыі Беларусі на набыццё бытавой тэхнікі, камп'ютараў, мабільных тэлефонаў і іншых відаў тавараў працяглага карыстання, які афармляецца непасрэдна па месцы продажу тавару. На сёння практычна ўсе буйныя гандлёвыя пляцоўкі могуць прапанаваць сваім пакупнікам скарыстацца крэдытнымі прадуктамі банка. Пералік гандлёвых пунктаў, дзе можна аформіць тавары ў крэдыт ад ЗАТ «Трастбанк» толькі па г. Брэсце, ужо перавышае 80 пунктаў, а па рэгіёне — больш за 120.

Таксама дапамагае развіццю гэтага кірунку ўвод новых крэдытных прадуктаў (такіх, як «Шалёны шопінг») і ўкараненне сучасных тэхналогій: крэдыт афармляецца работнікам прадпрыемства праз інтэрнэт на працягу паўгадзіны, пакуль кліент выбірае ўмовы крэдытавання. Гэты крэдыт выгадна вылучаецца не толькі хуткім прыняццем рашэння аб выдачы, але і адсутнасцю неабходнасці запаўняць паперы, падаваць даведку аб даходах або ўносіць першапачатковы ўзнос.

Што можа параўнацца з радасцю валодання жаданай рэччу? Можна ажыццявіць сваю мару прама цяпер, а не збіраць на яе грошы доўгія месяцы!

Юрый КАШТАНАЎ, старшыня праўлення ЗАТ «Трастбанк»:

## «ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СТАБІЛЬНАСЦІ БАНКА ЯК СУБ'ЕКТА ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН, АХОВА ІНТАРЭСАЎ І СРОДКАЎ КЛІЕНТАЎ — НАША САМАЯ ГАЛОЎНАЯ ЗАДАЧА»

**У верасні, пасля таго, як Прэзідэнтам краіны быў агучаны план па выхадзе на раўнаважны курс замежнай валюты, «Звязда» друкавала інтэрв'ю з экспертам — старшынёй праўлення ЗАТ «Трастбанк» Юрыем КАШТАНАВЫМ, дзе мы размаўлялі пра тое, як краіна ўспрыме новае курсаўтварэнне. Сёння мы зноў звярнуліся да Юрыя Міхайлавіча з просьбай патлумачыць, што змянілася за гэтыя амаль два месяцы і якія працэсы назіраюцца ў фінансавай сферы з моманту выхаду на плаваючы курс.**



— Што змянілася з моманту апошняй нашай сустрэчы? Перш за ўсё адбылася самая чаканая падзея — выхад на адзіны курс. І не адкрыю новых сакрэтаў, калі скажу, што гэта сапраўды знакавы і абнадзейвальны момант, зроблены ў рамках макраэканамічнай стабілізацыі. Калі ж казаць пра бягучую сітуацыю, то на сёння адна з асноўных задач макраэканамічнай стабілізацыі — гэта, безумоўна, барацьба з інфляцыяй. За гэты год стаўка рэфінансавання мянялася не раз — баюся памыліцца нават у колькасці разоў, але яе ўзровень на сёння 40%. Але гэтыя 40% ці нейкая іншая лічба — пэўны індыкатар, сігнал рынку, які кажа пра тое, што кошт запазычанняў будзе ўзрастаць. І, згодна з класічнымі падыходамі, неабходна імкнуцца да таго, каб было дадатнае значэнне даходнасці па беларускаму рублю. Але, на жаль, у эканоміцы не бывае прамых карэляцый: як правіла, усе сувязі ў эканоміцы складаныя. І сказаць «стаўкі павінны быць дадатнымі» вельмі проста, а вось зрабіць — цяжка, а часам нават і не магчыма. Чаму? З аднаго боку, сапраўды, павышаючы даходнасць па беларускім рублі і тым чынам робячы яго больш прывабным, мы тым самым стымулюем схільнасць да зберажэння. Адпаведна, здымаецца нагрузка з курсу (узмацняецца нацыянальная грашовая адзінка), бо насельніцтва вымае з-пад матрацаў грошы і нясе іх у банк, у эканамічны абарот. Але куды гэтыя грошы далей адпраўляць? Згодна з класічнай схемай, банк займае грошы і прадае іх далей, пакідаючы сабе пэўную маржу, за кошт чаго ён і жыве. Але куды гэтыя дарагія грошы сёння можна размяшчаць? Зразумела, што ў рэальны сектар. Але ў яго сёння свае праблемы, і кошт банкаўскага крэдыту, безумоўна, уплывае на рэнтабельнасць вытворчасці. Таму мы бачым абсалютна натуральныя межы павышэння стаўкі рэфінансавання з пункту гледжання яе ўплыву на развіццё эканомікі: рост стаўкі рэфінансавання прыводзіць да запавольвання эканамічнага росту.

**— Але з іншага боку, дарагія грошы прымушаюць рэальны сектар і ставіцца да іх па іншаму — больш эфектыўна выкарыстоўваць гэтыя сродкі. Правільна?**

— Сапраўды, напрыклад, бізнэсмен ці кіраўнік прадпрыемства трыццаць разоў падумае, браць яму крэдыт на развіццё якога-небудзь праекта або не браць, бо крэдытныя рэсурсы вельмі дарагія і няма сэнсу іх укладваць у праект, які не будзе эфектыўным, не акупіцца і не прынясе прыбытак. А калі ж грошы танныя, то іх можна адпраўляць у любыя праекты — нават у тыя, якія могуць быць і не заўсёды патрэбнымі. Таму можна сказаць, што дарагія грошы эканамічнымі метадамі стымулююць эфектыўнае выкарыстанне сродкаў і развіццё эфектыўных бізнэсаў, што яны садзейнічаюць структурнай перабудове эканомікі, пры якой неэфектыўныя сектары павінны спыніць існаванне або перапрафіляваца. Інакш кажучы, капіталы і працоўная сіла павінны мігрыраваць у эфектыўную вытворчасць і эфектыўныя сектары.

Але калі мы кажам словы «міграцыя капіталу і працоўнай сілы», то што мы маем на ўвазе? Гэта насамрэч сацыяльна-палітычныя стасункі. Бо міграцыя працоўнай сілы — гэта, па-сутнасці, звальненне людзей з аднаго месца і пераход іх на працу ў іншае. А гэта пытанне тонкае і сістэмнае. Таму на сёння стаіць вельмі складаная задача: пры структурнай перабудове эканоміцы не падарваць сацыяльны складнік, сацыяльна арыентаваную мадэль. Вядома, існуюць розныя рэкамендацыі Сусветнага банка, Міжнароднага валютнага фонду і гэтак далей — яны, безумоўна, правільныя з класічнага пункту гледжання. Але гэтыя рэкамендацыі, на жаль, не ўлічваюць мясцовага аспекту: дзяржава не можа не прымаць да ўвагі сацыяльны адказнасць. У старых капіталістычных сістэмах, якія былі ў 30-я гады, людзей маглі выгнаць на вуліцу, а потым ствараць нейкую новую мадэль. Але сёння і ў тых краінах урады вымушаны звяртаць увагу на сацыяльны аспект, я ўжо не кажу пра рэалізацыю ў нас гэтага ўсяго. Таму на сёння няма нейкіх прамых шляхоў, сёння ідзе, калі так можна сказаць, тонкая наладка. Немагчыма правесці структурную перабудову эканомікі, толькі пстрыкнуўшы выключальнікам.

**— Вы казалі, што ў рэальнага сектара сёння існуюць аб'ектыўныя праблемы. А банкі якім-небудзь чынам дапамагаюць прадпрыемствам?**

— Можна сказаць, што сёння перад банкамі стаіць дастаткова складаная задача — забяспечыць фінансавае падмацаванне рэальнага сектара для яго развіцця. Зараз прадпрыемствы рэальнага сектара сутыкаюцца з праблемамі зніжэння рэнтабельнасці, пагаршэннем фінансавага стану, але гэта будзе не заўсёды, а толькі на пэўны час, пакуль не пройдзе перабудова. Адпаведна, улічваючы гэтыя праблемы, мы, банкі, не можам механічна пераносіць кошт рэсурсаў, якія мы прыцягваем, на крэдыты. Бо прадпрыемствам тады будзе цяжка выжыць і вярнуць гэтыя крэдыты. Дый нам няма цікавасці ад таго, што прадпрыемства перастане існаваць — мы не хочам губляць свае грошы, кліентаў і г. д. Такім чынам, атрымліваецца, што мы сёння не можам даваць крэдыты рэальнаму сектару эканомікі пад тую стаўку, якую палічым для сябе эканамічна мэтазгоднай: мы вымушаны сёння ўлічваць інтарэсы прадпрыемстваў. За кошт чаго мы гэта робім? Калі на рынку грошы дарагія, то мы можам гэта зрабіць толькі адным шляхам — толькі праз зніжэнне сваёй маржы. Мы вымушаны дзяліцца даходнасцю з рэальным сектарам, каб падтрымаць яго ў бягучым моманце, даць магчымасць яму ўстаць на ногі, правесці структурную перабудову. Вось такая няпростая задача.

Тое самае тычыцца і грамадзян, хатніх гаспадарак: яны знаходзяцца ў той жа эканамічнай сістэме, што і рэальны сектар. Таму мы прагназуем зніжэнне прапановы крэдытавання на рынку фізічных асоб: на сёння хатнія гаспадаркі аб'ектыўна не ў стане ўспрыняць такі вялікі кошт крэдытаў. Разумеючы гэта, зараз банкі, і мы ў тым ліку, ідуць па шляху рэструктурызацыі крэдытаў, якія былі выдадзены раней: напрыклад, працягваюцца тэрміны, уводзяцца так званыя «працэнтныя вакацыі» і г. д. На сёння гэта адзіны разумны шлях для любога банка, і, дарэчы, такім чынам банк праяўляе сваю сацыяльную адказнасць — дзеліцца маржой з прадпрыемствамі і з фізічнымі асобамі.

Дарэчы, калі вяртацца да пытання аб эканамічным росце, то відавочна, што з-за зніжэння крэдытнай падтрымкі і прадпрыемстваў, і фізічных асоб эканамічны рост будзе запавольвацца. Але на сёння не важна, што прагнозы эканамічнага росту на наступны год вельмі сціплыя. Зараз самай важнай задачай з'яўляецца макраэканамічная стабілізацыя. І, безумоўна, банкі таксама працуюць у гэтым кантэксце: мы ставім перад сабой задачы перш за ўсё забяспечыць унутраную стабільнасць, стабільнасць арганізацыі, забяспечыць дакапіталізацыю банка, прыцягнуць інвестыцыі ў капітал, знізіць унутраныя выдаткі, правесці рэвізію лінейкі прадуктаў і г. д. Адным словам, нам, як і ўсім сёння, трэба павысіць эфектыўнасць працы, чым мы і займаемся — укараняем новыя формы працы і новыя каналы продажаў, распрацоўваем новыя прадукты, рэалізуем мадэль дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, каб доступ да паслуг банка ў нашых кліентаў быў 24 гадзіны ў суткі 365 дзён на год.

**— Як вы лічыце, пры той стаўцы рэфінансавання, якая вызначана сёння, ужо знойдзены пэўны баланс?**

— Ёсць шэраг простых паказчыкаў, якімі кіруецца банк для вызначэння таго, ці існуе збалансаванасць на рынку. Напрыклад, возьмем рост дэпазітаў насельніцтва: калі банкі прапануюць дэпазітныя прадукты для насельніцтва па нейкай пэўнай стаўцы (а яна так ці інакш прывязана да стаўкі рэфінансавання) і насельніцтва прыносіць грошы ў банк — значыць, грамадзяне лічаць такую стаўку адэкватнай. З іншага боку, трэба глядзець на крэдытны партфель: калі тут няма негатыўных тэндэнцый, то гэта гаворыць пра тое, што рэальны сектар і хатнія гаспадаркі гатовыя абслугоўваць узятыя пазыкі. Такім чынам, для нас важныя два гэтыя складнікі: рост дэпазітаў і адсутнасць сур'ёзных негатыўных тэндэнцый, звязаных з пагаршэннем крэдытных партфеляў. Калі гэтыя шалі балансуюць, то значыць, мы можам казаць пра нейкае набліжэнне да залатой сярэдзіны. А калі, напрыклад, мы бачым, што крэдыты пачынаюць не вяртацца, то гэта значыць, што грошы сталі вельмі дарагімі і, адпаведна, непад'ёмнымі для прадпрыемстваў ці грамадзян. А калі не адбываецца рост дэпазітаў — значыць, што стаўкі вельмі нізкія і нецікавыя для зберажэння.

Калі ж казаць пра сённяшнюю сітуацыю, то дэпазіты маюць схільнасць да павелічэння, да росту. Мы штотыдзень падводзім вынікі і бачым устойлівую тэндэнцыю — зніжэння няма адназначна, ёсць устойлівы рост дэпазітаў грамадзян і карпаратыўнага сектара. Наколькі я разумею, такая сітуацыя не толькі ў нашым банку, але і па сістэме ў цэлым. Што тычыцца праблемнай запазычанасці, то зараз яе стан мы можам ахарактарызаваць, як дастаткова стабільны.

**— А калі пачаўся рост дэпазітаў? Напэўна, усе чакалі аб'яднання сесій на біржы?**

— Не, гэта адбылося раней. Бо яшчэ перад гэтым была адкрытая другая сесія на Валютна-фондавай біржы, і новы курс ужо быў успрынята суб'ектамі эканамічных адносін. Звядзенне сесій мела дастаткова тэхнічны характар з пункту гледжання павышэння попыту і прапановы, а таксама падатковых нюансаў. Прынцыповы ж момант быў зроблены раней, калі мы ў цэлым выйшлі на нейкую лічбу, блізкую да стану раўнавагі. Таму я б сказаў, што тэндэнцыя да зберажэння ў насельніцтва стала з'яўляцца раней — калі стаўка рэфінансавання пачала рухацца ў бок павелічэння. А стабільнасць на валютным рынку — гэта дадатковая ўмова.




Цэнтральны сталічны офіс ЗАТ «Трастбанк» па вул. Старажоўская, 8.

**— Быў такі час, калі ў абменнікі людзі пайшлі масава здаваць валюту — тады нават у некаторых касах не хапала беларускіх рублёў. А якая зараз сітуацыя ў абменных пунктах?**

— На сёння няма ніякіх праблем: хапае ўсяго — і валюты, і беларускіх рублёў. Мы нават на біржу амаль не ходзім, а працуем на абароце. Можна сказаць, што мы сёння знаходзімся ў стане пэўнай раўнавагі. Таму мы не бачым на наяўным рынку нейкіх праблем ці дысбалансаў — усё ідзе ў рамках набыцця і продажу. Па-мойму, наш банк нават прадае на біржы замежную валюту, купленую ў абменных пунктах.

**— Давайце вернемся да дэпазітаў: як вы лічыце, у якой валюце для банка сёння больш выгадна прыцягваць сродкі — нацыянальнай ці замежнай?**

— Пытанне гэтае вельмі важнае і складанае. Для таго, каб банк прыняў рашэнне, у якой валюце яму фарміраваць прадукты, ён павінен разумець, што ён будзе далей рабіць з прыцягнутымі дэпазітамі, куды ён буза дзяваць гэтыя грошы, дзе ён будзе зарабляць, каб потым заплаціць працэнты ўкладчыкам і яшчэ сабе пакінуць даход.

Давайце спачатку разгледзім валютныя зберажэнні. Безумоўна, адна з найважнейшых задач у макраэканамічнай стабілізацыі — прыцягнуць у эканамічны абарот сродкі насельніцтва, прымусіць гэтыя грошы працаваць на эканоміку. Бо ў насельніцтва, па чутках, валюты хапае. Але банку трэба таксама ўяўляць, што з гэтай валютай рабіць далей. Паколькі грамадзянам мы крэдыты ў валюце не даём, то застаецца толькі крэдытаванне рэальнага сектара. Але і тут разумна будзе крэдытаваць у замежнай валюце толькі экспарцёраў і толькі праекты, якія маюць валютны складнік. А такіх праектаў на сёння на рынку не вельмі і шмат. Да таго ж валютаакупныя праекты, як правіла, носяць інвестыцыйны складнік — трэба будаваць новую вытворчасць, асвойваць новыя сектары. Гэта — працяглыя тэрміны. А ў хатніх гаспадарак сёння пакуль няма жадання ўкладваць грошы ў банкі на нейкія працяглыя прамежкі часу: грамадзяне пакуль не супакоіліся і цікавяцца кароткімі дэпазітамі — недзе да года. Але гэтыя сродкі, укладзеныя на тэрмін да года, мы не можам інвеставаць у працяглыя інвестыцыйныя праекты. Таму ўзнікаюць тут дысбалансы: мы з рынку можам браць «кароткія» грошы, а рэальны сектар патрабуе «доўгіх» грошай.

Плюс ёсць яшчэ адзін нюанс: прыцягваючы валюту ад юрыдычных асоб ці грамадзян, банкі павінны фарміраваць адпаведныя рэзервы ў Нацбанку. А яны фарміруюцца ў беларускіх рублях, якія сёння дарагія. Такім чынам мы адцягваем дарагую ліквіднасць і тым самым яшчэ дадаткова павышаем кошт валютных пазык. Па грубых падліках, механізм рэзервавання ў беларускіх рублях на прыцягненні ў замежнай валюце дадае 4,5-5% гадавых да стаўкі: напрыклад, калі мы прыцягваем валюту пад 9%, то банку гэта абыходзіцца недзе пад 14%. Гэта, дарэчы, яшчэ адзін прыклад таго, што няма простых рашэнняў і карэляцый. Якое тут можа быць развіццё далейшых падзей? Сёння ўжо рэальна намецілася тэндэнцыя зніжэння працэнтных ставак па дэпазітах у замежнай валюце менавіта з-за тых прычын, якія я ўжо назваў: банкі вымушаны зніжаць працэнтныя стаўкі, бо ім цяжка потым гэтыя пасівы размяшчаць. Але наколькі гэтую тэндэнцыю ўспрымуць хатнія гаспадаркі, ці захочуць яны несці грошы па стаўках, якія зніжаюцца — гэта пытанне. З іншага боку, нядаўна Нацыянальны банк знізіў рэзервовыя патрабаванні ад прыцягнутых валютных сродкаў з 9 да 7,5 працэнта. Гэта было зроблена таксама ў гэтым кантэксце: каб зняць з банкаў нагрузку з пункту гледжання прыцягнення сродкаў. Такім чынам, задача прыцягнення валюты ў эканамічны абарот — архіважная задача, але ёсць цэлы шэраг нюансаў. Я мяркую, што яны ўсе вырашацца, але павінен прайсці пэўны час, за які парасткі макраэканамічнай стабілізацыі стануць больш моцнымі.

Што тычыцца прыцягнення дэпазітаў у беларускіх рублях, то тут трохі прасцей: наконт прыцягнення ўкладаў у беларускіх рублях мы рэзервовых патрабаванняў не маем, і таму тут банкі знаходзяцца ў больш лаяльных умовах.

На сёння тактыка нашага банка — гэта такая тонкая наладка, пастаянны аператыўны кантроль. Для нас зараз галоўнае — гэта забеспячэнне стабільнасці банка як суб'екта эканамічных адносін, ахова інтарэсаў і сродкаў кліентаў. Сёння, яшчэ раз паўтаруся, галоўная задача ў эканоміцы, якая стаіць у тым ліку і перад банкамі, — гэта макраэканамічная стабілізацыя.

## ЗАТ «Трастбанк»: укараненне новых формаў працы і новых каналаў продажу, распрацоўка новых прадуктаў, рэалізацыя мадэлі дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання

Ала ТАРАСЕНКА, начальнік ЦБУ № 03/01 г. Гомель:

## «УМАЦОЎВАЦЬ І РАЗВІВАЦЬ СІСТЭМЫ КАРПАРАТЫЎНЫХ АДНОСІН»

Адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця банка з'яўляецца ўмацаванне і развіццё сістэмы карпаратыўных адносін з юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Будаўніцтва нашай стратэгіі і сістэмы кіравання грунтуецца на вопыце продажаў і выкарыстанні новых ідэй і новых інструментаў для поўнага задавальнення патрэб у банкаўскіх прадуктах нашых кліентаў.

Для дасягнення пастаўленых задач банк працягвае развіваць структурную сетку ў рэспубліцы. У цяперашні час абслугоўванне кліентаў карпаратыўнага бізнэсу ажыццяўляецца Цэнтрам банкаўскіх паслуг ва ўсіх абласных цэнтрах і раённых гарадах абласнога падпарадкавання.

Не выключэннем стаў і г. Гомель. З'яўляючыся другім па велічыні і колькасці насельніцтва, з магутным прамысловым патэнцыялам, горад павінен мець у сваёй структуры банк, заснаваны на даверы.

Гомельскае ЦБУ з'яўляецца лідарам па прыцягненні юрыдычных асоб на абслугоўванне.

З 2007 года банк прапануе свае паслугі гамяльчанам, а з 2010 года Упраўленне маркетынгу Цэнтра банкаўскіх паслуг № 03/01 г. Гомеля ЗАТ «Трастбанк» абслугоўвае карпаратыўных кліентаў, індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнэсу па ўсім спектры банкаўскіх паслуг. Гэта разлікова-касавае абслугоўванне з магчымасцю падключэння электронных плацежных сістэм «Кліент-Банк» і «Інтэрнэт-Банк», усе віды актыўных аперацый (лізінг, факторынг, паручыцельства/гарантыі), дакументарныя аперацыі (усе віды акрэдытываў, дакументарнае інкаса, банкаўскія гарантыі), дэпазіты, паслугі негандлёвага характару і іншыя аперацыі для юрыдычных асоб.

Вялікую стаўку мы робім на аказанне і развіццё якасна новых і перспектыўных паслуг.

Гэта «зарплатныя» праекты з выкарыстаннем пластыкавых картак прыватнай плацежнай сістэмы «Трастбанк» (Visa: Electron, Classic, Gold), аснашчэнне тэрмінальным абсталяваннем у офіса суб'екта гаспадарання, якое дазваляе аператыўна прымаць плацяжы ад кліентаў за аказаныя паслугі, супрацоўніцтва ў галіне спажывецкага крэдытавання (крэдыты насельніцтву на аплату тавараў і паслуг нашых кліентаў).

Тарыфы паслуг нашага банка самыя дэмакратычныя: адкрыццё і вядзенне бягучых рахункаў бясплатна, праграмнае забеспячэнне і ўстаноўка электроннага банка бясплатна, камісія за плацяжы ў сістэме «Інтэрнэт-Банк» 100 бел. руб. за плацежны дакумент, залічэнне выручкі бясплатна. Працэнтныя стаўкі па здзелках крэдытнага характару і па дэпазітах вызначаюцца кліентам дыферэнцавана ў залежнасці ад сітуацыі на рынку.

Усе вышэйпрыведзеныя лічбы сведчаць пра тое, што на сёння асноўнай тактычнай задачай банка з'яўляецца не аднамомантавае атрыманне прыбытку, а ўмацаванне сваіх пазіцый на Гомельшчыне са стратэгічнай мэтай умацаваць свой імідж і заняць належную нішу сярод вядучых банкаў краіны.

Мы рады бачыць прадстаўнікоў бізнэсу, а таксама гамяльчан у ліку нашых кліентаў.



Старшыня праўлення ЗАТ «Трастбанк» Юрый КАШТАНАЎ на прэзентацыі дэпазіта «Шкварка» ў Дудутках.

Трастбанк

### Цэнтры банкаўскіх паслуг

- **г. Брэст** вул. Карла Маркса, 82, тэл.: +375 162 21 06 44, маб. +375 25 989 98 64
- **г. Баранавічы** вул. Савецкая, 77, тэл.: +375 163 48 63 17, маб. +375 25 743 08 93
- **г. Пінск** вул. Першамайская, 44, тэл.: +375 165 32 44 54, маб. +375 25 989 98 24
- **г. Віцебск**, вул. Я. Купалы, 9, тэл.: +375 212 35 84 53, +375 212 35 84 54, маб. +375 25 989 98 67
- **г. Полацк** вул. М.Багдановіча, 10, тэл.: +375 214 48 37 59, +375 214 48 36 82, маб. +375 25 694 88 44
- **г. Наваполацк,** вул. Юбілейная, 2а, тэл.: +375 214 59 17 55, маб. +375 25 989 98 69
- **г. Орша,** вул. Шаўчэнкі, 50А, тэл.: +375 216 21 12 54, маб. +375 25 989 98 70
- **г. Гомель,** вул. Жаркоўскага, 22А, тэл: +375 232 71 75 39, +375 232 71 75 42, маб. +375 25 989 98 71
- **г. Мазыр,** бульвар Дружбы, 12, тэл.: +375 236 35 49 10, +375 236 35 38 36, маб. +375 25 989 98 72
- **г. Ліда**, вул. Савецкая, 26/1, тэл.: +375 154 55 08 11, маб. +375 25 602 55 97
- **г. Гродна**, вул. Дзяржынскага, 30, тэл.: +375 152 72 00 70, +375 152 73 80 99, маб. +375 25 901 12 25
- **г. Барысаў,** вул. Будаўнікоў, 26, тэл.: +375 177 73 24 67, маб. +375 25 989 98 73
- **г. Салігорск,** вул. Ленінскага Камсамола, 40, тэл.: +375 174 24 10 66, +375 174 22 27 02, маб. +375 25 989 98 74
- **г. Магілёў,** зав. Пажарны, 1а, тэл.: +375 222 22 51 54, +375 222 25 83 64, маб. +375 25 989 98 63
- **г. Бабруйск,** вул. Дзяржынскага, 68, тэл.: +375 225 52 15 12, +375 225 52 26 16, маб. +375 25 989 98 75

### Экспрэс-прадстаўніцтвы

- **г. Мінск,** вул. Леніна, 8 (ААТ «ГУМ») тэл. маб.:+375 25 743 08 54
- **г. Брэст,** пр. Машэрава, 52, тэл.: +375 162 21 17 45, факс: +375 162 23 42 82
- **г. Пінск,** вул. Цэнтральная, 21, тэл.: +375 165 36 54 53
- **г. Гомель,** пр-т Леніна, 16, тэл. маб.: +375 25 602 57 28
- **г. Гродна**, вул. Савецкіх пагранічнікаў, 95, тэл. маб.: +375 44 770 07 02
- **г. Барысаў,** вул. Будаўнікоў, 26, тэл.: +375 177 76 12 62



Наталля КІРПІЧЭНКА, намеснік начальніка ЦБУ 08/01 г. Магілёва:

## «ГРОШЫ ПАВІННЫ ПРАЦАВАЦЬ НА ПРЫБЫТАК»

Магілёўскае ЦБУ ЗАТ «Трастбанк» — перадавое па прыцягненні ўкладаў ад насельніцтва.

З цягам часу рэальная пакупніцкая здольнасць грошай зніжаецца, а грошы павінны працаваць і прыносіць прыбытак. Па ўсёй эканамічнай логіцы, банкаўскія дэпазіты — самае разумнае ўкладанне капіталаў, тым больш калі стаўкі такія высокія. Плюсы банкаўскіх укладаў: дадатковы даход (працэнты), гарантыя захаванасці, магчымасць вярнуць у выпадку неабходнасці. Калі магілёўцаў цікавяць банкаўскія ўклады з выдатнымі ўмовамі і высокімі працэнтнымі стаўкамі, то яны абавязкова звяртаюцца ў ЗАТ «Трастбанк», менавіта прывабнасць нашых дэпазітаў садзейнічае прыросту ўкладаў насельніцтва ў магілёўскім рэгіёне.

На рынку банкаўскіх паслуг у Магілёўскай вобласці ЗАТ «Трастбанк» працуе з 2000 года.

У новым прадукце «Шкварка» ЗАТ «Трастбанк» пастараўся ўлічыць усе пажаданні кліентаў і прапанаваць кароткатэрміновыя ўклады ў беларускіх рублях з магчымасцю папаўнення першапачатковай сумы на ўмовах раней заключаных дамоў. Яшчэ адзін немалаважны момант — працэнтныя стаўкі, якія банк «прывязаў» да стаўкі рэфінансавання. Даходнасць па ўкладах вырасла да 52%.

Не пакінуты без увагі і ўкладчыкі, якія доўгі час захоўвалі вернасць нашаму банку. А такіх кліентаў у Магілёве нямала. Пасля рэарганізацыі філіяла ў ЦБУ № 08/01 і пераезду ў новы будынак, мы не страцілі сваю раней напрацаваную базу, а наадварот, толькі прымножылі. Для пастаянных укладчыкаў дзейнічае акцыя «Плюс адзін», якая прадугледжвае павелічэнне дзейнай працэнтнай стаўкі на адзін пункт па наноў прыцягнутых укладах у замежнай валюце. На сёння — гэта магчымасць размясціць уклады ў доларах ЗША і еўра пад 11 працэнтаў гадавых.

Банк не стаіць на месцы. Для тых, хто хоча мець пастаянны доступ да сваіх грошай, мы прапануем карт-рахункі «Спрынт-Дэпазіт». Вялікі плюс — ніякіх затрат пры адкрыцці рахунку. У адрозненне ад звычайнага карт-рахунку, даходнасць па «Спрынт-Дэпазіце» залежыць ад астатку і вар'іруецца ад 15% да 40% гадавых у беларускіх рублях і да 9,5% у доларах ЗША. Не ўзнікае праблем з папаўненнем і зняццем грашовых сродкаў з рахунку. У вас у руках з'яўляецца ўклад з рэжымам функцыянавання «да запатрабавання», які прыносіць рэальны даход. Магчымасць падключэння банкаўскіх паслуг М-банкінг і SMS-банкінг дазваляе ажыццяўляць розныя жыццёва неабходныя плацяжы ў любы час сутак: ад аплаты паслуг аператараў мабільнай сувязі да пераводу сродкаў з адной пластыкавай карты на другую. Акрамя таго, картку можна выкарыстоўваць для безнаяўных аперацый у гандлёвых сетках. Ніводзін банкаўскі ўклад не мае такіх пераваг.

Можна з гордасцю адзначыць, што нашы дэпазітныя прадукты ўжо больш за дзесяць гадоў застаюцца самымі цікавымі, разнастайнымі і запатрабаванымі ў банкаўскай сферы.




ЗАТ «Трастбанк» — удзельнік спецыялізаванай выставы «Банк. Страхаванне. Лізінг».

УНП 100789114 Матэрыялы рэкламна-інфармацыйнай старонкі падрыхтавалі Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Павел БЕРАСНЕЎ.



# РАЗАБРАЦЦА З НАРКАТЫЧНЫМ МАКАМ!

**ЗАБРУДЖАНАЕ насенне, з якога лёгка гатуецца наркатычны раствор, нескладана набыць у Беларусі. Саджаць за краты дылераў амаль немагчыма, а рэальная колькасць «бубачных» наркаспажыўцоў крытычная — па некаторых звестках, каля 120 тысяч чалавек. І гэта ў час, калі такія наркаманы гінуць як мухі.**

**Сітуацыя была адлюстравана ў журналісцкім расследаванні «З-за чаго пастаўкі наркатычнага маку ў Беларусь не могуць спыніць?» («Звязда» за 10 лістапада 2011 года).**

**Водгукі на расследаванне ад былых наркаспажыўцоў паказваюць: «бубачнікі» — гэта не толькі «нізы»: яны працуюць таксістамі, кіруюць грамадскім транспартам, зарабляюць на заводах... А навукоўцы б'юць трывогу: сітуацыя пагражае генафонду беларускай нацыі!**

**У той жа час заканадаўства пакуль працуе так, што зацікаўленыя ў спыненні паставак маку ведамствы, такія як міліцыя і мытня, абмежаваны законамі і не могуць цалкам спыніць небяспеку.**

**Пасля выхаду расследавання журналіст «Звязды» сустрэўся з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Зінаідай МАНДРОЎСКАЙ і начальнікам Упраўлення па наркакантролі сталіцы Канстанцінам ЛЯШКЕВІЧАМ. Аўтарытэтныя дзяржаўныя чыноўнікі ўпэўніваюць, што сітуацыю можна выправіць. І тлумачаць, што для гэтага варта зрабіць.**

У час, калі я гутарыў з Канстанцінам Рамановічам, у сталіцы грымелі гучныя канфіскацыі наркатычнага маку і машын, з якіх тавар рэалізоўваўся. Гэта з падачы старшыні мінскага Наркакантролю ў прадаўцоў «бубак» пачалі забіраць аўтамабілі.

Барыгі (прадаўцы «бубак») афармляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, плоцяць падаткі і такім чынам абараняюцца ад канфіскацый. Аднак міліцыя знаходзіць новыя і новыя метады барацьбы. Толькі спыніць барыг штрафамі — немагчыма, занадта вялікія прыбыткі яны маюць (каля 3000 долараў на самага дробнага наркатаксіста, які працуе двое сутак праз двое). Разам з тым прадаўцы наркатычнага тавару хаця б перасталі чыніць свой промысел нахабна і не хаваючыся.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Зінаіда Мандроўская пачала займацца «бубачнай» праблемай паўтара года таму. Пасля таго, як паступілі скаргі ад выбаршчыкаў. І жахнулася: насенне маку варылі ў ацэтоне і калоліся не толькі маргіналы, але і звычайныя рабочыя, і нават шматдзетныя мамы. Зінаіда Міхайлаўна, як і належыць дэпутату, пачала гучна звяртаць увагу на праблему. І, дзякуючы свайму аўтарытэту, была пачутая.

Якія крокі неабходна зрабіць найперш?

### «ТРЭБА НЕАДКЛАДНА НАЛАДЗІЦЬ УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ЎСІХ ВЕДАМСТВАЎ СУПРАЦЬ НАРКАМАНІІ...»

— Чаму пачала займацца гэтай праблемай? Выбаршчыкі пры сустрэчах скардзяцца. Прыходзяць мамы, чые дзеці спажываюць наркотыкі, — кажа Зінаіда Мандроўская. — У 2010 годзе мы дабіліся новага дзяржаўнага стандарту на мак. Мытня пачала правяраць пастаўкі харчовага маку, і некаторыя партыі арыштоўваліся, таму што мелася засмечанасць макавай саломкай. Але пад выглядам капусты, яблыкаў партыі ўсё адно да нас праходзяць. І чаму сёння гэта праблема стала яшчэ больш вострай? Таму што — супольная мытная прастора, адкрытая мяжа з Расіяй.

Сітуацыя такая, што ніхто не павінен праяўляць абыякавасць. Не папаўняюць жа наркагандляры бюджэт, яны папаўняюць свае кішэні і забіваюць нашых маладых людзей. Калі наркаман мае сорак гадоў, то гэта нонсэнс. Усе маладыя, таму што яны не дажываюць. Сур'ёзна пашкоджваюцца ўсе ўнутраныя органы і псіхіка.

**— Наша журналісцкае расследаванне паказала, што купіць мак нескладана. Наркаспажыўцы лёгка знаходзяць сыравіну і колюцца...**

— Удалося вырашыць некаторыя пытанні. Але не ўдалося дабіцца ўзаемадзеяння ўсіх ведамстваў, якія павінны забяспечваць супрацьнаркатызацыі. Мы пакуль не сталі шчыльнымі радамі супраць гэтай праблемы. А трэба было б!

**— Я, калі рыхтаваў артыкулы пра «бубкі» і шматлікія «эйфарыйныя парашкі», натыкаўся на дзясяткі аб'яў у інтэрнэце. І быў здзіўлены, чаму гэта не кантралюецца. Няўжо некаторыя не бачаць праблемы?**

— Я атрымлівала і такія адказы: *«Чаму вы задаяце дзіўныя пытанні? Гэта ж булачкі...»*. Такая пазіцыя выклікала здзіўленне. Як можна за паўгода 800 тон маку выкарыстаць на булачкі?

Многія ведамствы — МУС, Дзяржаўны мытны камітэт — спрабуюць змагацца з праблемай, але неабходнага ўзаемадзеяння з некаторымі іншымі ведамствамі, на мой погляд, недастаткова.

З гэтай прычыны я звярталася ва ўрад. У адказах гучала, што пытанні часам абмяркоўваюцца падчас каардынацыйных нарад, якія праводзіць Міжведамасны савет.

З прыходам новага ўрада я зноў паведаміла аб праблеме ў сваім звароце. У сувязі з тым, што зараз створана супольная мытная прастора, наркатычная праблема зрабілася яшчэ больш актуальнай. Якія б меры ні прадпрымаў Мытны камітэт, мак можа прыходзіць праз мяжу з Расіяй, і ніхто ведаць не будзе. Гэта факт.

Нядаўна я мела размову з адказнымі работнікамі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сказала, што ёсць такая праблема і яе нельга замоўчваць, што неабходна ўзяць і сумесна яе абмеркаваць, каб выпрацаваць сумесныя прапановы.

Упэўненая, што спецыяльная нарада адбудзецца, будуць выслуханы розныя пункты гледжання, у тым ліку Міністэрства ўнутраных спраў, Генпракуратуры, Вярхоўнага Суда, Міністэрства адукацыі і гэтак далей.

Важна выпрацаваць стратэгічныя падыходы. Не раз за паўгоддзе ці раз за квартал сустракацца, а працаваць увесь час. Тады шмат што вырашыцца.

Займацца праблемай наркаманіі трэба сур'ёзна, а не траціць потым грошы на лячэнне. А колькі злачынстваў здзяйсняецца з-за наркаманіі! А наш генафонд!

Неабходна наладзіць узаемадзеянне і знайсці людзей, якія будуць зацікаўлены ў вырашэнні гэтай праблемы, мабілізаваць усё грамадства і СМІ.

Змагла ж наша краіна на высокім узроўні вырашыць пытанне па супрацьдзеянні гандлю людзьмі. І з наркапагрозай мы павінны справіцца, каб не пакутвалі ні дзяржава, ні маладыя людзі.

### НЕКАТОРЫЯ ЧЫНОЎНІКІ ПРОСТА НЕ РАЗУМЕЛІ СУТНАСЦЬ НЕБЯСПЕКІ?

*«Бубкі» шырока прысутнічаюць на беларускім наркарынку (з 2004-2005 гадоў). І толькі з 2010-га былі прыняты першыя меры па супрацьдзеянні — зменены дзяржаўны стандарт, які забараніў дамешкі макавай саломы.*

*У чым справа? Што перашкаджала папярэдзіць праблему раней?*

***Кіраўнік сталічнага Наркакантролю Канстанцін ЛЯШКЕВІЧ** лічыць, што мела месца банальнае неразуменне праблемы.*

— Калі Міністэрства ўнутраных спраў у 2006-м, 2007-м, 2008-м гадах тлумачыла і нешта даказвала, некаторыя чыноўнікі «хі-хі, ха-ха», «як гэта мы будзем жыць без булачак з макам?» — *абураецца Канстанцін Рамановіч.* — Людзі не разумеюць, што харчовая прамысловасць закупляе абсалютна іншы мак. Найчасцей гэта блакітнае насенне з Чэхіі ці Польшчы. Гэты мак праходзіць спецыяльную тэрмічную апрацоўку, і наркатычны раствор з яго не вырабляецца. Значыць, булачкі з макам і пончыкі ў нас будуць.

Што тычыцца забруджанага насення, то, па міжнародных стандартах, наркотыкам яно не з'яўляецца. Але ж гэта страшны наркотык, бо нашы «ўмельцы» навучыліся вырабляць з яго наркатычны раствор.

### «ЗАБАРАНІЦЬ ГАНДАЛЬ МАКАМ І САПРАЎДЫ ЖОРСТКА ШТРАФАВАЦЬ ЗА ГЭТА!»

**— Якія захады, на вашу думку, неабходна зрабіць найперш, каб спыніць пастаўкі наркатычнага маку?** — *цікавімся ў старшыні сталічнага Наркакантролю.*

— Найперш чаму б не зрабіць, як урад Краснадарскага края? Яны ўзялі і забаранілі абарот насення маку.

А харчовая прамысловасць знаходзіла магчымасць закупак.

Калі тое ж зробяць у Беларусі, у турму за продаж насення ўсё роўна саджаць не будуць. Але трэба зрабіць сапраўдны сур'ёзны штраф, канфіскоўваць машыны. Ніхто тады не павязе праз адкрытую мяжу з Расіяй фуру маку. Сёння ты прадаў, заўтра ў цябе канфіскуюць і фуру, і мак. Мы аналізуем сітуацыю і ведаем, якія дыяспары займаюцца «бубкамі», хто іх прывозіць, каго трэба кантраляваць.

Калі існуе праблема, давайце на год забаронім продаж маку і паглядзім на сітуацыю. Ніякіх спыненняў грашовых патокаў гэта не пацягне. Яшчэ раз хачу паўтарыць — забруджанае насенне ўвозіцца незаконна. Людзі зразумеюць, што гэта забаронена, і проста не павязуць да нас.

### ЯК АРГАНІЗАВАЦЬ ТАТАЛЬНЫ КАНТРОЛЬ ЗА ПАСТАЎКАМІ МАКУ?

*Як аналізавалася ў журналісцкім расследаванні «Звязды», дзяржманаполія на пастаўкі маку магла б вырашыць праблему. Камерцыйным прадпрыемствам забаранілі б увозіць «бубкі» на тэрыторыю Беларусі, такія пастаўкі маглі б расцэньвацца як кантрабанда. Зінаіда Мандроўская выказвае думку, як магчыма ажыццявіць ідэю татальнага кантролю паставак маку.*

— Мне падабаецца ідэя ўводу дзяржаўнай манаполіі на гандаль макам. Хапае іншых тавараў, каб прадпрымальнікі маглі гандляваць. Адзін мак не сыграе ролі. Гэта ж не нафта, якую ўсе спажываюць.

**— Але супольная мытная прастора не дазваляе....**

— Значыць, у межах Мытнага саюза трэба выпрацоўваць меры. Калі нельга зрабіць дзяржманаполію, няхай ліцэнзіі на гандаль макам выдадуць. Магчыма ж у нас выдача ліцэнзій на гандаль алкаголем. Дзвюх арганізацый, напрыклад, дастаткова, каб была канкурэнцыя. Арганізацыя кожны раз будзе вымушана даваць тавар на даследаванне, атрымліваць заключэнне, рабіць справаздачы: колькі прывезена, куды пайшло. Усё павінна быць празрыстым.

А так — вязуць усе. Быццам інакш не заробіш. Ну проста слоў няма! Трэба абавязкова насенне маку вазіць: усе будзем булачкі пячы!

Таму ўсё можна вырашыць, калі захацець. Калі мы будзем думаць пра будучыню, усё здарыцца так, як трэба. Пазіцыю трэба даводзіць адкрыта, шчыра. І тады ўсё стане на свае месцы.

### ЦІ ЗМОГУЦЬ ПАЗБАЎЛЯЦЬ ВОЛІ ЗА ГАНДАЛЬ НАСЕННЕМ МАКУ?

*Журналісцкае расследаванне «Звязды» паказала яшчэ адну праблему. Сучасныя методыкі даследавання насення маку, якія ўжываюцца ў Беларусі, на жаль, не паказваюць наяўнасць алкалоідаў опію ў насенні. Наркаспажыўцы з дапамогай растваральніку апіяты выцягваюць, а экспертыза іх наяўнасць канстатаваць не можа. Няма апіятаў — няма турэмных тэрмінаў.*

— Калі існуюць у свеце методыкі, якія паказваюць наяўнасць опію ў насенні, то яны павінны быць і ў нас, — *падкрэслівае з гэтай нагоды Зінаіда Мандроўская.* — Ёсць праблема: калі насенне маку асобна, а растваральнік асобна, то гэта сёння не наркотык. Таму я пакуль не магу даць адказ на пытанне, як саджаць дылераў у турму за гандаль забруджаным насеннем маку. Але трэба паслухаць спецыялістаў: што яны думаюць на гэты конт? Я сама па адукацыі — хімік. Я разумею, што алкалоід не можа не прысутнічаць у насенні, раз з яго гатуюць наркотык. Калі опій прысутнічае, значыць павінны быць і методыкі, якія выяўляюць наяўнасць опію. Наркаспажыўцы ведаюць методыкі, як выцягваць алкалоіды з насення маку і потым калоцца, значыць і методыкі трэба зрабіць. Няма нічога невырашальнага.

Я ведаю адно: калі ты хочаш вырашыць праблему, знойдзеш час і сродкі. Калі ты не будзеш яе вырашаць — знойдзеш прычыну. Таму будзем шукаць сродкі і сілы, а не шукаць апраўданні, што гэтага зрабіць нельга.





### ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ РАЗВІЦЦЁ НАРКАМАНІІ Ў ШКОЛАХ?

*Зінаіда Міхайлаўна адзначае, што распаўсюджванне наркаманіі можна загадзя папярэджваць яшчэ са школьнага ўзросту. Але прафілактыка ва ўстановах адукацыі пакуль не такая эфектыўная, як хацелася б.*

— Трэба змяніць стаўленне да праблемы. Я прапаноўвала адным з пунктаў *«Праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь»*, каб у школах увялі адміністрацыйную адказнасць за ўтойванне фактаў спажывання наркотыкаў альбо алкагалізму.

Неабходна не толькі наладзіць належную прафілактыку, але і выкарыстаць самы шырокі досвед замежны, грамадскіх аб'яднанняў, псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў.

Можна ўводзіць з пятага, шостага, сёмага класаў адукацыйны курс, які граматна паказваў бы, што гэта такое.

Ніхто з дзяцей не дадумаецца бегчы і скакаць у ледзяную ваду, ведаючы пра наступствы. А тут маецца масавая з'ява. Дзіця хоча паспытаць наркотыкі, бо многія яго разбэшчваюць, ведаючы, што ў бацькоў ёсць грошы, што гэтым можна будзе скарыстацца. Таму прапаноўваюць. Дзесьці побач са школамі, праз нейкіх знаёмых. Бацькі і школа павінны давесці дзіцяці, што гэта небяспечна.

Я не псіхолаг, але я ўпэўнена, што ў нас ёсць моцныя спецыялісты, якія маглі б стварыць адмысловыя тэсты, праграмы, электронныя матэрыялы. Каб у многіх дзяцей не ўзнікла жадання паспытаць наркотыкі.

*Канстанцін Ляшкевіч прапаноўвае абапірацца на гатовы досвед некаторых краін.*

— У першую чаргу менавіта школы павінны быць зацікаўлены ў выпраўленні становішча. Калі прыйшоў чалавек на заняткі, і ў яго вочы выглядаюць падазрона, дзіця неадэкватна сябе паводзіць, нельга гэта ўтойваць, — *пераконвае Канстанцін Рамановіч.* — Бо ў нас часта бывае, калі ў школе здарыўся інцыдэнт, ёй ужо мінус. Дык, выбачайце, гэта было даўным-даўно.

Мы сочым за сусветным досведам. Як шведы лічаць? Чым раней мы пачнём дапамагаць чалавеку, які трапіў пад дрэнны ўплыў, тым больш будзе ў яго шанцаў выжыць.

Жыццё складаецца з прыступак. Чалавек пачаў брыдкасловіць — яму ніхто не зрабіў заўвагу. Потым — курыць, потым — піць піва. І ніякіх заўваг. Потым ён пачаў нюхаць пакет — і таксама бацькі прамаўчалі. Потым ён пачынае курыць марыхуану, наступны крок — да ін'екцыйных наркотыкаў. А калі б сітуацыю не ўтойвалі з самага пачатку, гэтага б не здарылася.

У ЗША цяжкая сітуацыя з наркотыкамі была ў 70-х-80-х гадах. Яны прымусілі ўсе ўстановы адукацыі супрацоўнічаць з паліцыяй, каб мець інфармацыю па збытчыках і своечасова ўсё гэта прыпыняць. І ў іх праблема рэзка скарацілася.

**Яўген ВАЛОШЫН.**



**Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ**

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (Пінская гарадская выбарчая акруга № 14).**

**Намеснік старшыні Камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў.**

**Журналістам Зінаіда Міхайлаўна вядомая сваёй жорсткай антынаркатычнай і антыалкагольнай пазіцыяй, ініцыятывамі ў працоўным і падатковым заканадаўстве, захадамі ў абароне інвалідаў.**



**Канстанцін ЛЯШКЕВІЧ**

**Начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама, палкоўнік міліцыі.**

**Вядомы бескампраміснай пазіцыяй у дачыненні да нарказбытчыкаў, ноу-хау ў барацьбе з распаўсюджваннем наркотыкаў і гучнымі выкрываннямі наркалабараторый.**



## ОБЪЯВЛЕНИЕ

**5 декабря 2011 г. СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

# ОАО «Камволь»

**Собрание пройдет по месту расположения Общества: г. Минск, ул. Маяковского, 176, конференц-зал, 4 этаж главного корпуса.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. О создании совместного предприятия по производству упаковки.

*Докладчик: генеральный директор — Стрижак С.В.*

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, 176, ком. 204, тел.: 223 17 02, 3-15.

**Начало работы собрания 15.00.**
**Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 1 декабря 2011 года.

Для регистрации при себе иметь паспорт.

УНП 100074393

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
отказывается от проведения аукциона по продаже находящихся в коммунальной собственности г. Минска акций открытых акционерных обществ, объявленного на 30 декабря 2011 г.
Информационное сообщение о проведении аукциона, опубликованное в газете «Звязда» 15 ноября 2011 г. № 217 (27081),
**считать утратившим силу.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Открытый аукцион по продаже объекта государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества (далее – аукцион) состоится **28 декабря 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, каб 227, конт. тел. (017) 200 20 89.

**На аукцион выставляется:**

| № лота | лот № 1 |
|---|---|
| Предмет аукциона | Имущество и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания |
| Место нахождения недвижимого имущества | Минская область, Минский район, Колодищанский сельсовет, 0,7 км юго-западнее пос. Колодищи |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 540 429 975 белорусских рублей (в том числе: недвижимое имущество – 381 885 115 белорусских рублей, право заключения договора аренды земельного участка – 158 544 860 белорусских рублей) |
| Размер задатка (рублей), срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | 54 000 000 белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе** |
| Продавец недвижимого имущества | Управление образования администрации Партизанского района г. Минска, 220037, г. Минск, ул. Бумажкова, 37, тел.: (8017) 294 63 34, 245 79 80 |
| Информация о земельном участке для обслуживания недвижимого имущества | Общая площадь – 0,7936 га; кадастровый номер земельного участка – 623683400001000184; срок аренды – 20 лет |
| Арендодатель земельного участка | Минский районный исполнительный комитет |
| Характеристика недвижимого имущества | В состав имущества входят: 9 зданий неустановленного назначения 1964 года постройки, из них: 6 одноэтажных дощатых зданий с пристройками площадью от 93,7 до 122,9 кв.м, 2 щитовых здания с пристройками (столовая и изолятор) площадью 232,1 кв.м и 104,5 кв.м; кирпичное здание сарая площадью 94,2 кв.м – 1970 года постройки; 2 уборные (кирпич); асфальтобетонная проезжая часть 142 кв.м; 3 асфальтобетонные площадки площадью 85 кв.м, 9 кв.м, 56 кв.м; пешеходная часть с бортом площадью 375 кв.м; бассейн; 2 деревянных беседки по 6 кв.м; ограждение деревянное на металлических столбах 202 м; ограждение деревянное на ж/б столбах 300 м; ограждение ж/б на ж/б столбах; 411 штук насаждений многолетних; 5 штук кустарников; газон площадью 5 957 кв.м |
| Условия использования недвижимого имущества | Без условий |
| Условия использования земельного участка | Изменение в установленном порядке назначения недвижимого имущества и использование земельного участка для размещения объекта, предназначенного для организованного массового отдыха населения и туризма |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**К участию в аукционе допускаются:** граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), консолидированные участники (два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в аукционе, следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка в белорусских рублях на расчетный счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителям заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 27 декабря 2011 года включительно.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Оплата имущества производится в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи в бюджет г. Минска на транзитный счет № 3602101000026 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 795, получатель – Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по г. Минску, УНП 100690830, назначение платежа 04 706.

Минский райисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку).

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

В случае изменения назначения недвижимого имущества победителю аукциона (претенденту на покупку) необходимо получить в установленном порядке разрешение Минского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, и осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, Организатору аукциона, после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским райисполкомом – договор аренды земельного участка.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка не предусмотрена.

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42 61 62**

**Продавец: Оршанское районное потребительское общество, 211030, Республики Беларусь, г. Орша, ул. Ленина, 214 А , тел. (0216) 24 00 35**

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика | Начальная цена (бел.руб.) с НДС | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-36100, площадь – 695,1 кв.м., назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада угля, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая, 81/20 на земельном участке с кадастровым №242400000001012256, площадью 0,1657 га. | 74 520 000 | 7 452 000 |
| Аукцион состоится 27.12.2011г. в 10.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи документов: с 28.11.2011 с 8.30 по 26.12.2011 до 17.30. | | | |

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика | Начальная цена (бел.руб.) без НДС | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-33460, площадь – 158,1 кв.м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – контора (одноэтажное кирпичное с пристройкой), воздушная линия, стройматериалы, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая, 81А на земельном участке с кадастровым №242400000001012243, площадью 0,6175 га. | 75 000 000 | 7 500 000 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-33461, площадь – 80,4 кв.м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – проходная (одноэтажное кирпичное), весовая, весы автомобильные, въездные ворота, расположенные по адресу: Витебская обл., г.Орша, ул.1-го Мая, 81/2 на земельном участке с кадастровым №242400000001012219, площадью 0,2303 га. | 21 000 000 | 2 100 000 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-33462, площадь – 52,1 кв.м, назначение – здание специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция (одноэтажное кирпичное), два силовых трансформатора, подземный кабель, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая, 81/4 на земельном участке с кадастровым №242400000001012218, площадью 0,0365 га. | 27 305 000 | 2 730 500 |
| 4 | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-34569, площадь – 341,8 кв.м, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание квасильно-засолочного цеха (одноэтажное кирпичное с подвалом, сходом в подвал), расположенное по адресу: Витебская обл., г.Орша, ул.1-го Мая, 81/10 на земельном участке с кадастровым №242400000001012217, площадью 0,1142 га. | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 5 | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-34716, площадь – 545,2 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склад-ангар (одноэтажное металлическое), расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая, 81/13 на земельном участке с кадастровым №242400000001012222, площадью 0,1361 га. | 63 000 000 | 6 300 000 |
| 6 | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-34570, площадь – 57,1 кв.м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание болерной (одноэтажное кирпичное с пристройкой), расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая, 81/15 на земельном участке с кадастровым №242400000001012220, площадью 0,0905 га. | 8 037 300 | 803 730 |
| 7 | Капитальное строение с инвентарным номером 240/С-33459, площадь – 493 кв.м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад материалов №1 (одноэтажное кирпичное), основная тепловая сеть, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. 1-го Мая, 81/16 на земельном участке с кадастровым №242400000001012221, площадью 0,2360 га. | 230 000 000 | 23 000 000 |
| **Аукцион состоится 28.12.2011 г. в 10.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи документов: с 28.11.2011 с 8.30 по 27.12.2011 до 17.30. Победитель аукциона (претендент на покупку) уплачивает НДС в размере 20% от цены продажи имущества.** | | | |

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

1. Для участия в аукционе приглашаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы.

2. Лицами, желающими принять участие в аукционе, к заявлению прилагаются: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении; индивидуальным предпринимателем — копия свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом — доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем иностранного инвестора — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя — доверенность. При подаче документов предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона (претендент на покупку) подписывает протокол о результатах аукциона в день проведения аукциона.

4. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона.

5. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан заключить договор купли-продажи не позднее 20 дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить предмет аукциона согласно сроков, указанных в договоре купли-продажи.

6. Реквизиты для перечисления задатка: р/счет № 3012218220012 в головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 150801701 (в бел. руб.); №3012000009469 (дол. США), №3012000010184 (рос. руб.) в ф-ле №201 ОАО «АСБ «Беларусбанк», МФО 150801259, УНП 390477566.

7. Организатор торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения торгов.

8. Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42 61 62, (029) 514 36 47, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

# АХОВА
## ПАД ЗНАКАМ САВЫ
№ 11 (27)




**СУМЕСНЫ ВЫПУСК «ЗВЯЗДЫ» І ДЭПАРТАМЕНТА АХОВЫ МУС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, ПРЫСВЕЧАНЫ 59-й ГАДАВІНЕ ЗАСНАВАННЯ СЛУЖБЫ АХОВЫ**

**„НАШЫ МІЛІЦЫЯНЕРЫ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЬ БЯСПЕКУ НЕ ТОЛЬКІ АБ'ЕКТАЎ, АЛЕ І ПРАПАНОЎВАЮЦЬ ПАСЛУГІ ФІЗІЧНАЙ АХОВЫ. ПРАДУХІЛЯЮЦЬ ПРАНІКНЕННЕ АСОБ, ЯКІЯ ВЫНОШВАЮЦЬ ТЭРАРЫСТЫЧНЫЯ, ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ І ІНШЫЯ ПАГРАЖАЛЬНЫЯ НАМЕРЫ"**

**„СУПРАЦОЎНІКІ АДПАВЯДАЮЦЬ ПЭЎНЫМ ПАТРАБАВАННЯМ: РОСТ НЕ НІЖЭЙ ЗА 185 СМ, ВЫДАТНАЯ СТРАЯВАЯ ВЫПРАЎКА, КАМУНІКАБЕЛЬНАСЦЬ, ВЕТЛІВАСЦЬ, ДАЛІКАТНАСЦЬ, УМЕННЕ ПРЫМАЦЬ ПРАВІЛЬНЫЯ І ЎЗВАЖАНЫЯ РАШЭННІ, ВІТАЕЦЦА ВЕДАННЕ ЗАМЕЖНАЙ МОВЫ"**

Генадзь ЛОСЕЎ, палкоўнік міліцыі, начальнік упраўлення Дэпартамента аховы МУС па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў:

# «КРЫТЭРЫІ АДБОРУ: ВЫПРАЎКА, КАМУНІКАБЕЛЬНАСЦЬ, АБАЯННЕ»

**У складзе Дэпартамента аховы МУС існуе ўпраўленне па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў. Супрацоўнікі толькі гэтага падраздзялення аховы штодня заступаюць на службу ў белых кашулях. Іх можна ўбачыць на тэрыторыі пасольстваў, на ўрачыстых і афіцыйных прыёмах з прысутнасцю дыпламатаў, на аб'ектах нацыянальнага тэлебачання і радыё. Тры месяцы таму, пасля выхаду на заслужаны адпачынак палкоўніка міліцыі Віктара Свірыдэнкі, упраўленне ўзначаліў палкоўнік міліцыі Генадзь Лосеў. Сёння ён дзеліцца некаторымі сакрэтамі свайго незвычайнага падраздзялення і гісторыяй яго ўзнікнення.**



Неабходнасць ахоўваць дыпламатычныя прадстаўніцтвы замежных дзяржаў узнікла адразу пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У 1992 годзе была створана рота міліцыі па ахове дыпламатычных і консульскіх прадстаўніцтваў пры УУС Мінгарвыканкама. Пасля адбыўся шэраг структурных змяненняў: з павелічэннем колькасці прадстаўніцтваў неабходна было пашыраць штат падраздзялення. Спачатку быў створаны батальён, а ў лютым 1994 года полк міліцыі і асобны батальён былі аб'яднаныя ва Упраўленне дзяржаўнай аховы МУС Рэспублікі Беларусь. У студзені 1995 года створана Галоўнае ўпраўленне дзяржаўнай аховы МУС Рэспублікі Беларусь, а з лістапада 1995-га па жнівень 1999-га падраздзяленне вырасла да ўпраўлення па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў Галоўнага ўпраўлення дзяржаўнай аховы пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

У жніўні 1999 года, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 470, загадам Міністра ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь у Аб'яднанні «Ахова» пры МУС (цяпер Дэпартамент аховы МУС) было створана ўпраўленне па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў. З гэтага моманту ўпраўленне складалася з апарата ўпраўлення і батальёна міліцыі, у склад якога ўваходзілі 3 роты і 3 падраздзяленні ў Віцебску, Брэсце і Гродне. Першапачаткова ўпраўленне камплектавалася супрацоўнікамі тэрытарыяльных аддзелаў Мінскага гарадскога ўпраўлення аховы, адкамандзіраванымі для праходжання службы.

У снежні 2005 года батальён міліцыі становіцца спецыяльным батальёнам міліцыі, у абласных гарадах Віцебск, Брэст і Гродна ствараюцца аднайменныя аддзяленні ўпраўлення.

***— Генадзь Віктаравіч, якія асноўныя мэты і задачы Вашага ўпраўлення і яго супрацоўнікаў?***

— Супрацоўнікі УАДПіКУЗД перш за ўсё ажыццяўляюць ахову тэрыторыі дыпламатычных прадстаўніцтваў, консульскіх устаноў і рэзідэнцый кіраўнікоў прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, а таксама іншых асабліва важных дзяржаўных аб'ектаў. Нашы міліцыянеры забяспечваюць бяспеку не толькі аб'ектаў, але і прапаноўваюць паслугі фізічнай аховы. Прадухіляюць пранікненне асоб, якія выношваюць тэрарыстычныя, правакацыйныя і іншыя пагражальныя намеры нанесці якую-небудзь шкоду.

***— Якія крытэрыі адбору на службу ва ўпраўленне?***

— Паколькі нашы супрацоўнікі фактычна з'яўляюцца пасрэднікамі паміж прадстаўніцтвам той ці іншай дзяржавы і беларускім бокам, то некаторыя нюансы існуюць. Напрыклад, калі пасольствы праводзяць афіцыйныя мерапрыемствы па лініі Міністэрства замежных спраў з удзелам вышэйшых службовых асоб дзяржавы, то для забеспячэння бяспекі такога кшталту прыёмаў у нашым упраўленні створана спецыяльнае падраздзяленне. Яго супрацоўнікі адпавядаюць пэўным патрабаванням: рост не ніжэй за 185 см, выдатная страявая выпраўка, камунікабельнасць, ветлівасць, далікатнасць, уменне прымаць правільныя і ўзважаныя рашэнні, вітаецца веданне замежнай мовы. Немалаважную ролю адыгрывае асабістае абаянне, рашучасць і добрасумленнасць. Штодзень супрацоўнікі пасольстваў звяртаюцца да міліцыянераў і па іх адказам мяркуюць аб усіх жыхарах Беларусі.

***— Як вы адчуваеце сябе ў ролі кіраўніка такога няпростага падраздзялення? Што самае складанае ў гэтай ролі?***

— У кіраўніцтве нашым калектывам я асаблівых складанасцяў не бачу. Калі правільна падабраць вядучых кіраўнікоў — начальнікаў службаў, аддзелаў, аддзяленняў — то любыя задачы па плячы. Да сваёй пасады я быў цалкам гатовы, не адзін год у падраздзяленні, і калі б хоць адна доля сумнення закралася, то я ні за што не стаў бы яго ўзначальваць.

Я пачынаў у маленькіх падраздзяленнях і лічу, што для станаўлення кіраўніка гэта вельмі важна. У невялікім аддзеле адзін чалавек, нягледзячы на займаную пасаду, ахоплівае агульны круг абавязкаў. Унікае ў масу розных пытанняў, якія за яго ніхто вырашаць не будзе. Такі супрацоўнік як будучы кіраўнік вельмі перспектыўны — закранаючы не адзін пласт аспектаў працы, ён развіваецца і ўдасканальваецца, дасягаючы высокіх мэтаў. Наконт станаўлення кіраўнікоў, маё глыбокае перакананне, што чалавек, які прапрацаваў працяглы час на адным месцы, не можа стаць добрым начальнікам. Каб кіраваць людзьмі, ты сам, перш за ўсё, павінен быць падкаваны ў розных галінах і быць заўсёды на галаву вышэйшы за іншых, каб павесці людзей за сабой, паказваючы прыклад ва ўсім.

***— Зыходзячы з вашага паслужнога спіса, можна сцвярджаць, што служба ў ахове — гэта лёсавызначальны спадарожнік вашага жыцця?***

— Я «прыкіпеў» да аховы, таму што спазнаў працу гэтай службы знутры. А калі ў любой справе адчуваеш сябе як рыба ў вадзе, працуецца лёгка, і дасягнуць чагосьці значна прасцей. У маім жыцці так склалася, што служба ў ахове спадарожнічала мне, нават калі я крочыў у іншым напрамку — быў участковым інспектарам міліцыі грамадскай бяспекі АУС Чэрвеньскага райвыканкама, намеснікам начальніка АУС Заслаўскага гарвыканкама. Але асноўную частку службовай дзейнасці прысвяціў ахове.

Мне складана ўседзець на адным месцы, як чалавеку, які імкнецца даведацца як можна больш. Таму папрацаваў на розных пасадах — ад простага інспектара да кіраўніка аддзела, а пасля і ўпраўлення. Я не прывык шукаць лёгкага шляху, значна цікавей пачынаць фактычна з нуля і даводзіць тую ці іншую справу да канца.

***— На ваш погляд, якія якасці супрацоўнікаў спрыяюць зладжанай працы ўнутры калектыву? Чаго вы не прымаеце?***

— Я прывык спаганяць з людзей роўна столькі, колькі магу выканаць сам. На ўласным прыкладзе даказваю і пераконваю падначаленых, што нічога немагчымага няма, было б жаданне. А жаданне і імкненне — гэта галоўныя якасці ў любой працы. У адносінах паміж начальнікам і падначаленым павінна быць адкрытасць, і ў гэтым пытанні я прыхільнік канструктыўнага дыялогу. У стасунках з падначаленымі люблю ініцыятыўнасць і прадукцыйнасць. Заўсёды гатовы заахвоціць тых, хто ўносіць новыя павевы ў працу, не баючыся аступіцца.

Добрым для ўсіх быць немагчыма — гэта агульнапрынятае меркаванне. Для мяне ж па-чалавечы важна, дзе б я ні працаваў, каб мяне разумелі, сустракалі з пазітыўнымі эмоцыямі. Заўсёды заставацца чалавекам — гэта дарагога каштуе!

***— Якія планы вашага ўпраўлення на перспектыву?***

— Без інавацый бессэнсоўна існаванне ў прынцыпе, таму развіццё ўпраўлення плануецца. Паколькі адносіны Беларусі з іншымі дзяржавамі развіваюцца імкліва, то і нам працы прыбаўляецца. Поле дзейнасці падраздзялення збіраецца стаць значна маштабнейшым: будуць адкрывацца новыя дыпламатычныя прадстаўніцтвы, узрастуць аб'ёмы аховы, колькасць самога ўпраўлення ўзрасце. Будзем ісці ў нагу з часам!



**Дэпартамент аховы: ажыццяўленне аховы тэрыторыі дыпламатычных прадстаўніцтваў, консульскіх устаноў і рэзідэнцый кіраўнікоў прадстаўніцтваў замежных дзяржаў, а таксама іншых асабліва важных дзяржаўных аб'ектаў.**

ВОПЫТ

# Ля вытокаў службы

**Адным з тых, хто ў ліку першых паступіў на службу ва ўтворанае 12 гадоў назад упраўленне па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, быў малодшы інспектар аховы старшы прапаршчык міліцыі Уладзімір Галавацкі.**



Нарадзіўся Уладзімір Аляксеевіч у вёсцы Кіраў Нараўлянскага раёна ў шматдзетнай сям'і. Закончыўшы ў 1982 годзе сярэднюю школу, быў прызваны ў армію. Паўгода правёў у «вучэбцы» ў Літве, а затым служыў у дэсантна-штурмавой брыгадзе ў Германіі. «Так атрымалася, што пасля дэмабілізацыі магчымасці пайсці вучыцца ў мяне не было, — расказвае Уладзімір Аляксеевіч, — і я пайшоў служыць у полк міліцыі па ахове дзяржаўных органаў». Першым ахоўным аб'ектам для Галавацкага стаў тэлецэнтр на вуліцы Камуністычнай, затым камандаваў аддзяленнем аховы ў ЦК кампартыі, потым «дарос» да намесніка камандзіра ўзвода Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 1986 годзе Уладзімір Аляксеевіч прымаў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. На выселенай тэрыторыі ў Брагінскім раёне супрацоўнікі міліцыі сачылі за грамадскім парадкам, забяспечвалі захаванасць маёмасці, пакінутай у дамах, магазінах, школах.

— Галоўная задача нашай сённяшняй службы, — гаворыць старшы прапаршчык, — гэта забеспячэнне бяспекі іншаземных персон, якія прадстаўляюць свае дзяржавы на тэрыторыі нашай рэспублікі. Мы павінны забяспечваць грамадскі парадак паблізу пасольстваў і ў будынках, ахоўваць увесь дыпламатычны корпус. Іншаземцы павінны спакойна прыходзіць на працу і быць упэўненымі ў сваёй бяспецы.

Уладзімір Аляксеевіч служыў на пастах у розных пасольствах і консульствах, а апошнім часам яго пастаяннае месца працы — Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь. За 26 гадоў службы ў праваахоўных органах старшы прапаршчык ні на хвіліну не пашкадаваў аб выбраным аднойчы і пройдзеным міліцэйскім шляху.

Ёсць ва Уладзіміра Аляксеевіча і непрывычнае для мужчыны, які носіць пагоны, хобі — разам з жонкай на дачы яны вырошчваюць ружы, а яшчэ ён любіць частаваць сям'ю смачнымі нацыянальнымі стравамі ўласнага прыгатавання.

РАДЫЁЭФІР

# ВЕТЛІВАСЦЬ І ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦЬ

**З прадстаўніцай цудоўнага полу 3-й роты спецыяльнага батальёна міліцыі ўпраўлення па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў мы сустрэліся прама на рабочым месцы — на пасту радыёстанцыі «Радыус-FM». Прынята лічыць, што першае ўражанне бывае падманным, але ў нашым выпадку добразычлівасць і ветлівасць сяржанта міліцыі Наталлі Шабалінай аказаліся сапраўднымі. На службу ў органы ўнутраных спраў Наталля прыйшла 17 лістапада 2008 года. Стаць міліцыянерам марыла з дзяцінства і ўпэўнена ішла да пастаўленай мэты. Закончыўшы юрыдычны каледж з чырвоным дыпламам, Шабаліна паступіла на юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта і цяпер заканчвае апошні, шосты курс.**



— Я заўсёды прытрымліваюся думкі, што супрацоўнікі органаў унутраных спраў — гэта людзі высокай годнасці, якія валодаюць высокімі маральнымі якасцямі. Таму юрыдычны кірунак у навучанні я выбрала выключна з тых меркаванняў, што стану міліцыянерам.

Праца Наташы ў асноўным звязана з кантрольна-прапускным рэжымам: агляд падазроных грамадзян, ручной паклажы, недапушчэнне пабочных асоб, ахова работнікаў ад усялякіх замахаў, адсочванне сітуацыі на прылеглай тэрыторыі радыёстанцыі з дапамогай відэаназірання. Прасцей кажучы, забеспячэнне спакойнага функцыянавання радыёвяшчання.

— Штодзень я вітаю супрацоўнікаў, якія прыходзяць на працу. Можа, камусьці гэты факт падасца банальным, але мне вельмі прыемна сваім пазітыўным настроем прыўносіць невялікую часцінку радасці людзям, якія «акунаюцца» ў працоўныя будні. Мне зусім не цяжка пажадаць добрай раніцы, прыемнага дня, удачнага эфіру, сустрэць гасцей, якія прыходзяць на радыёстанцыю. Абменьваючыся пазітывам штодзень, жыццё раскрываецца зусім у іншым колеры.

Прафесія юрыста патрабуе пэўнага складу характару: прынцыповасць, рашучасць і ўпэўненасць у сабе — такія якасці ўласцівыя паспяховым спецыялістам у гэтай галіне. Такая катэгарычная трактоўка вобразу юрыста зусім не бянтэжыць дзяўчыну: «Я аддаю перавагу больш лаяльным спосабам вырашэння праблем, але калі трэба, зыходзячы з сітуацыі, магу паказаць усе скрытыя бакі майго характару — усё залежыць ад абставін».

Нягледзячы на яшчэ зусім небагаты вопыт, Наталля дастаткова падаросламу разважае пра жыццё: «Кожны чалавек павінен знайсці сваю сцяжынку, каб ад любой справы атрымліваць задавальненне, на працу спяшацца з усмешкай і вяртацца ў прыўзнятым настроі».

Свой вольны час Наташа не марнуе: сустрэчы з сябрамі, прагулкі, паездкі, паходы ў тэатр. А яшчэ калегі бурна абмяркоўваюць кулінарныя стравы, прыгатаваныя дзяўчынай. Апошнім сваім самым цікавым захапленнем яна лічыць вышыўку — ікона Казанскай Божай Маці, вышытая бісерам, вартая ўсякіх пахвал.

Як гаворыцца ў народнай прыказцы, «дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам». Зараз першачарговая мэта Наталлі — атрымаць афіцэрскія пагоны. А вынікі яе ўпартай працы не прымусяць доўга чакаць, бо чалавек, які марыць пакінуць свой след у гісторыі службы і ўнесці належны ўклад у працу, не можа застацца незаўважаным!

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі:
У. ЗДАНОВІЧ, А. ГЕРАСІМАЎ, А. ЯРМАЛІНСКАЯ, Н. СВІДУНОВІЧ, Я. ТАЛАЙ.

# ПІЛЬНАСЦЬ І ГРАМАТНАСЦЬ ДЗЕЯННЯЎ



Апошняе перад водпускам начное дзяжурства старшыны міліцыі Яўгена Губарэвіча, малодшага інспектара аховы спецыяльнага батальёна ўпраўлення па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, пачыналася як звычайна. «Сюрпрызы» з'явіліся бліжэй да поўначы. Абыходзячы тэрыторыю пасольства Расійскай Федэрацыі на вуліцы Новавіленскай, міліцыянер звярнуў увагу на шумную групу моладзі, якая яўна была нападпітку, але быццам мірна крочыла па тратуары. Раптам ад іх аддзялілася фігура маладога чалавека. Хлопец, пагойдваючыся, падбег да жылога дома, на першым паверсе якога размяшчаецца крама «Тропинка», узлез на парапет агароджы і сарваў Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь (сталіца багата была ўпрыгожана напярэдадні Дня горада). Пакінуць без увагі падобныя дзеянні незнаёмца старшына Губарэвіч, зразумела, не мог. Але пакуль ён бег да парушальніка, крыкам спрабуючы спыніць непарадак, хлопец дастаў чорны маркёр і на сцягу, кінутым на асфальт, паспеў зрабіць непрыстойны надпіс.

26-гадовы непрацуючы мінчанін супраціву пры затрыманні не аказаў, а хутчэй, не паспеў з-за алкагольнага ап'янення. Следча-аператыўная група даставіла затрыманага ў Цэнтральнае РУУС для разбору. Сёння яго дзеянні кваліфікаваныя па артыкуле 370 Крымінальнага кодэкса — знявага дзяржаўных сімвалаў — і ў дачыненні да маладога чалавека заведзена крымінальная справа.

А Яўгена Губарэвіча, які праявіў пільнасць і граматнасць дзеянняў, заахвоцілі на службе, што з'явілася нядрэнным падарункам да вяселля старшыны!

# УЦІХАМІРЫЛІ ЗЛАМЫСНІКА

**МАЛОДШЫЯ сяржанты міліцыі Аляксандр Шумчэня і Аляксей Мацвяеня, малодшыя інспектары аховы асобнага батальёна ўпраўлення па ахове дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў, вечарам былі, так бы мовіць, не пры выкананні. Аляксандр знаходзіўся ў водпуску, а Аляксей толькі што змяніўся з дзённага дзяжурства. Яны іншагароднія, таму ў складчыну здымаюць кватэру на вуліцы Несцерава.**



Каля 20.00 міліцыянеры пачулі горкі дзіцячы плач з лесвічнай пляцоўкі. Мацвяеня першым выскачыў за дзверы. 10-гадовы Максім з суседняй кватэры скрозь слёзы расказаў, што толькі што ля ўваходу ў пад'езд у яго «незнаёмы п'яны дзядзька адабраў сотавы тэлефон». Сяржанты не марудзілі, узялі дзіця за руку і выскачылі на вуліцу. Адначасова Шумчэня, спытаўшы ў хлопчыка абаненцкі нумар, набраў яго на сваім тэлефоне. Ля пад'езда замерлі, азіраючыся па баках, чакаючы злучэння — раптам пашанцуе? Так і ёсць, з боку апошняга пад'езда пачулася мелодыя, мужчына падняў апарат да вуха і стаў аглядацца. Хлопчык адразу пазнаў свайго крыўдзіцеля. Міліцыянеры падышлі да мужчыны, прадставіліся і паспрабавалі вырашыць сітуацыю мірным шляхам, але той асыпаў іх нецэнзурнай лаянкай, спачатку палез у бойку, а пасля кінуўся ў пад'езд, дзе ён, аказваецца, жыў. Пакуль Шумчэня выцягваў п'янага буяна на вуліцу, Мацвяеня выклікаў падмацаванне з Заводскага РУУС. Разам з нарадам патрульна-паставой службы ахоўнікі ўціхамірылі 45-гадовага правапарушальніка. У наручніках ён быў дастаўлены ў райупраўленне міліцыі.

Шумчэня і Мацвяеня — маладыя супрацоўнікі: Аляксандр на пасадзе са студзеня, Аляксей — з мая. Вось ужо сапраўды, не заўсёды молада — зелена. Хлопцы прыйшлі ў міліцыю свядома, ужо маючы пэўную фізічную і маральную падрыхтоўку. Шумчэня адслужыў тэрміновую ў 103-й брыгадзе ВДВ у Віцебску, а Мацвяеня — у штабе пагранвойскаў у сталіцы.

# ДОБРЫ ПРЫКЛАД МАЛАДЫМ

**ДЛЯ многіх супрацоўнікаў беларускай міліцыі, якія прымалі прысягу яшчэ ў савецкія часы, дата 10 лістапада назаўсёды засталася святочнай. Раней у гэты дзень вартавыя правапарадку адзначалі сваё прафесійнае свята, а сёння ў свята ёсць афіцыйная назва — Дзень ушанавання ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў МУС Рэспублікі Беларусь.**



Напярэдадні свята ў апараце Дэпартамента аховы прайшла ўрачыстая сустрэча ветэранаў службы аховы. Начальнік дэпартамента палкоўнік міліцыі Сяргей Буйноўскі павіншаваў усіх прысутных са святам, успомніў пра доблесныя подзвігі былых супрацоўнікаў, падзякаваў ветэранам за актыўную жыццёвую пазіцыю і ўдзел у справах калектыву. Намеснік начальніка дэпартамента па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні палкоўнік міліцыі Віталь Казлоўскі ўручыў ветэранам Ганаровыя граматы Дэпартамента аховы МУС. Акрамя таго, у рамках сустрэчы прайшоў арганізацыйны сход пярвічнай ветэранскай арганізацыі дэпартамента пад старшынствам яе кіраўніка Мікалая Іваненкі, дзе былі абазначаны праблемы ветэранаў, вызначаны перспектыўныя кірункі работы пярвічкі, а таксама прыняты новыя члены ў яе шэрагі. Па завяршэнні сустрэчы ветэраны ўсклалі кветкі да стэлы «Памяці супрацоўнікаў аховы, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў».

На жаль, не ўсе ветэраны па стане здароўя змаглі прысутнічаць на ўрачыстым мерапрыемстве. Супрацоўнікі апарату дэпартамента і ветэранскай арганізацыі ўсіх іх без выключэння наведалі па месцы жыхарства, аказалі маральную і матэрыяльную падтрымку. Традыцыйна супрацоўнікі аховы пабывалі на магілах тых, хто ўжо пайшоў у іншы свет, дзе навялі парадак і ўсклалі кветкі.

10 лістапада ветэраны органаў унутраных спраў сустрэліся на ўрачыстым канцэрце ў канферэнц-зале Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра. Афіцыйную частку мерапрыемства правёў намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік папярэдняга расследавання генерал-маёр міліцыі Сяргей Гурэеў. Сяргей Віктаравіч падзякаваў ветэранам за шматгадовую службу па ахове грамадзян ад злачынных замахаў, выказаў удзячнасць за тое, што яны заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу маладому пакаленню, шчодра падзяліцца прафесійным вопытам.

Канцэртная праграма, прадстаўленая пераможцамі агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў МУС, прыйшлася ўсім па душы. А песня «Міліцэйскі вальс» у выкананні міліцыянера Лідскага аддзела Дэпартамента аховы малодшага сяржанта міліцыі Яўгеніі Бацяноўскай стала своеасаблівым гімнам праваахоўнікаў усіх прысутных у зале пакаленняў.

У фае будынка для гасцей была арганізавана персанальная выстаўка вышытых карцін былога начальніка прэс-бюро тады яшчэ Аб'яднання «Ахова» пры Міністэрстве ўнутраных спраў падпалкоўніка міліцыі ў адстаўцы Валянціны Семянюк. Вышыўкай яна захапілася яшчэ ў маладосці. «Гэта цяпер вочы «разбягаюцца» ад разнастайнасці матэрыялаў для гэтага захаплення, — расказвае Валянціна Іванаўна, — а раней з цяжкасцю можна было дастаць канву, спецыяльныя іголачкі. Памятаю, як з дапамогай экспертаў-крыміналістаў па фрагменціках размнажала малюнкі сваіх будучых работ». У асноўным час для вышывання жанчына «выкройвае» па начах, таму і серыю сваіх работ назвала «Бяссонніца». Сярод іх ёсць і зімовы пейзаж, і нацюрморт, і кухонныя наборы. Вышыўка карціны — карпатлівая праца. На адну мастацкую работу ў Валянціны Іванаўны ідзе да сямі месяцаў. А над такой карцінай, як «Снегіры», яна працавала роўна год. Зараз Валянціна Іванаўна захапілася яшчэ і вышыўкай бісерам. З такіх навінак на выстаўцы была прадстаўлена «Маці Божая Казанская». Калекцыя Валянціны Іванаўны складаецца з больш чым 50 твораў. «Шмат работ я падарыла блізкім, сябрам, родным. Па народным павер'і вышыўка — гэта абярэг дома, — дзеліцца Семянюк, — але ніводнай работы я не прадала».



У міліцыю Валянціна Іванаўна трапіла выпадкова. Сваю працоўную дзейнасць пачынала мантажніцай на Мінскім прыборабудаўнічым заводзе, затым вучылася на вячэрнім аддзяленні Інстытута замежных моў. Атрымаўшы вышэйшую адукацыю, Семянюк адправілася ў аддзел кадраў УУС Мінгарвыканкама. Там дзяўчыне прапанавалі паспрабаваць сябе ў якасці інспектара дзіцячага пакоя міліцыі, аднак афармленне дакументаў зацягнулася, і ў выніку маладога спецыяліста прызначылі інструктарам па прапагандзе і агітацыі асобнага дывізіёна дарожнага нагляду. Дзяржаўтаінспекцыі Валянціна Іванаўна аддала 13 гадоў. За гэты час у эфір Беларускага радыё выйшла больш як 800 выпускаў яе аўтарскай праграмы «Хвілінка бяспекі». Затым Валянціна Іванаўна ўзначаліла толькі што створанае прэс-бюро Аб'яднання «Ахова». З гэтай пасады ў званні падпалкоўніка міліцыі і пайшла на заслужаны адпачынак. Заўсёды ўважлівая, спагадлівая, разважлівая, Валянціна Іванаўна і сёння нарасхват у многіх былых калег, ніколі не адмаўляе ў дапамозе і новаспечаным супрацоўнікам. Сваёй энергічнасцю і кампетэнтнасцю ў многіх пытаннях Валянціна Семянюк уяўляе сабой непаўторны і цудоўны прыклад для пераймання маладым.

